## ТЭМА 1.
## Прадмет і задачы вучэбнай дысцыпліны, яе месца ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук

***Практыкаванне 1.*** *Прачытайце тэкст. Вызначыце яго тэму.*

*Сфармулюйце яго асноўную думку. Пры адказе выкарыстайце адзін з прапанаваных пачаткаў:* у тэксце разглядаецца (што?), гаворыцца (пра што?), даецца ацэнка, аналіз (чаго?), абагульняецца (што?), прадстаўлены пункт погляду (на што?), расказваецца (пра што?), з тэксту стала вядома (што?).

Мова – не толькі сродак зносін, а і душа народа, аснова і важнейшая частка яго культуры. Жыве мова – жыве народ. Кожная мова, яе літаратурная, жывая мясцовая і гістарычная разнавіднасць – неацэнны скарб, які належыць не аднаму народу, а ўсяму чалавецтву.

Гонар і абавязак усіх – шанаваць родную мову, садзейнічаць яе развіццю і росквіту, паважліва ставіцца да моў іншых народаў.

У Беларусі здаўна жывуць людзі розных нацыянальнасцей, гучаць розныя мовы. Аднак у апошнія гады сфера ўжывання мовы карэннага насельніцтва Беларусі, якое дало ёй імя і гістарычна складае асноўную частку жыхароў рэспублікі, значна звузілася, пад пагрозай апынулася само яе існаванне. Паўстала неабходнасць аховы беларускай мовы на дзяржаўна-этнічнай тэрыторыі. Такую сістэму аховы дазваляе стварыць толькі наданне беларускай мове статусу дзяржаўнай мовы Беларускай ССР.

Статус беларускай мовы як дзяржаўнай не закранае канстытуцыйных правоў грамадзян іншых нацыянальнасцей карыстацца рускай ці іншымі мовамі. Усе грамадзяне Беларускай ССР, незалежна ад нацыянальнасці і роднай мовы, карыстаюцца роўнымі правамі і маюць роўныя абавязкі перад дзяржавай (Закон «Аб мовах у Беларускай ССР»).

*Ці можна замяніць слова* ***мова*** *на слова* ***маўленне*** *ў першым сказе тэксту? Патлумачце свой адказ.*

*Якім тэрмінам можна замяніць спалучэнне* ***жывая народная*** (*мова*) *у другім сказе?*

*Якія мовы ў Рэспубліцы Беларусь маюць статус дзяржаўных?*

*Ці з’яўляюцца тоеснымі паняцці «нацыянальная мова» і «дзяржаўная мова»? Аргументуйце свой адказ.*

***Практыкаванне 2.*** *Прачытайце верш. Вызначыце яго тэму.*

*Спішыце тэкст. Паздзяліце яго на сэнсава завершаныя часткі, абазначце канец кожнай часткі знакам паўзы* (//).

*У кожнай частцы падкрэсліце словы, на якія падае лагічны націск.*

*Вызначыце лексічнае значэнне слоў* ***плёск, росны, водгулле, заззяць.***

*Прачытайце выразна верш.*

Мова,
Пявучая родная мова,
Ты – уладарка нявызнаных скарбаў,
Столькі значэнняў,
гучання і фарбаў
Мае ў сабе тваё кожнае слова.
Іншае слова напоўнена плёскам
Хвалі дняпроўскай.
Іншае слова такое,
Што рэха лясное
Ў яго глыбінях затоена.
Ёсць і як мёд залатое, густое,
На травах яно духмяных настоена.
Ціха гучаць у мове маёй
Словы пяшчотныя,

Словы крынічныя,
Росныя.
Чуюцца ў ёй –
І грымотныя,
Зычныя.
Водгулле бітваў у іх
Разлягаецца грознае.
Часам бывае – заззяе неспадзявана
Новаю зоркаю слова-абнова.
Колькі ў табе нявызнаных скарбаў схавана.
Мова мая,
Пявучая родная мова (А. Зарыцкі).

*Успомніце, якія функцыі выконвае мова ў грамадстве. Пра якія з іх гаворыць аўтар верша?*

***Практыкаванне 3.*** *Прачытайце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.*

*Назавіце прыказкі, якія могуць ужывацца ў адной сітуацыі.*

*Пра якія асаблівасці вуснага і пісьмовага маўлення гаворыцца ў прыказках?*

Выказанага слова да губы не вернеш. Са свайго языка спусціш – на чужым не зловіш. Слова – вецер, а папера – грунт. Слова знікае – напісанае застаецца. Сказанага слова за хвост не зловяць. Конь вырвецца – здагоніш і зловіш, а слова вырвецца – не зловіш. Слоўка як птушка: выпусціў – не вернеш. Што напісана пяром, не выйме і сякера. Якая птушка, такі і галасок. Які розум, такая і гаворка.

***Практыкаванне 4.*** *Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Пастаўце неабходныя знакі прыпынку.*

*Патлумачце, на якія віды нормаў вы абапіраліся.*

**Цана слова**

Правілы маўле(н,нн)я складаліся ў народзе стаго(дздз,ддз)ямі. Яны былі сціслыя памерам мелі форму прыка(с,з)кі прымаўкі зага(д,т)кі (фразеалагізм). У іх а(т,д)біўся ка(л,лл)ектыўны (в)опыт нашых (про(д,т)кі).

Народ уважліва выпрацо(ў,в)аў правілы карыста(н,нн)я словам. Шмат якія прыка(с,з)кі і прымаўкі (в)учаць паводзінам у (гутарка). Народная мудрас(ь)ць па(д,т)казвае, як слухаць с(у,а)размоўніка і р(эа,ыа)гаваць на яго словы, чаму трэба быць стрыманым у час размовы, як трэба ўлічваць а(б,п)ставіны маўле(н,нн)я. Перш чым нешта сказаць трэба падумаць у(з,с)важыць кожнае слова.

Каб належным чынам вес(ь)ці гутарку, трэба ўмець слухаць таго, з кім гаворыш. Гутарка з людз(ь)мі крыніца (з,с)вестак ведаў уме(н,нн)яў (паводле А. Каўруса).

*Праверце правільнасць выканання задання* (*ключ змешчаны ў Дадатку 2*).

## ТЭМА 2.
## Беларуская мова як адзін з базавых элементаў нацыянальнай культуры беларусаў

***Практыкаванне 5.*** *Узгадайце падзеі з гісторыі беларускай мовы, якія адбыліся ў названыя гады. Запоўніце табліцу.*

| | |
|---|---|
| 1918 г. | |
| 31 ліпеня 1920 г. | |
| 15 ліпеня 1924 г. | |
| 1933 г. | |
| 1957 г. | |
| 26 студзеня 1990 г. | |
| 01 верасня 2010 г. | |

***Практыкаванне 6.*** *Прачытайце тэкст. Пра які перыяд з гісторыі развіцця беларускай мовы ідзе гаворка ў тэксце? Чаму гэты перыяд у гісторыі беларускай мовы называюць «залатым часам»?Як вы думаеце, у які час тэкст быў напісаны? Абгрунтуйце сваё меркаванне.* Беларуская мова належыць да ўсходняе галіны славянскіх моў.Сучасная беларуская мова злажылася паступова, гістарычна, з мовы тых славянскіх пляменьняў, што леглі ў аснову беларускае народнасьці. Аб стане беларускае мовы да XIII веку, за бракам дакладных ведамасьцяй, трудна з пэўнасьцю судзіці, бо з тае далёкае эпохі мы ня маем іншых здабыткаў беларушчыны, апроч некаторыхназоваў мясцовасьцяй і людзей, што спатыкаюцца ў кроніках і дакумэнтах іншых народаў. Затое пачынаючы з XIV веку, мы маем такое мноства розных пісаных дакумэнтаў з сьлядамі беларускае мовы, як ніводзін славянскі народ усходняе галіны. Мы маем мноства грамат і актаў, асабліва судовых, і іншых старасьвецкіх пісаных дакумэнтаў, шмат рукапісных кніг – кніг да набажэнства, біблійных, летапісаў, кронік, апавяданьняў, а яшчэ больш старадрукарскіх кніг. У вадным толькі Віленскім архіве апісаных актаў налічваецца больш за 200 000, грамат да канца толькі XV веку вядома больш за 130; рукапісных кніг не юрыдычнага характару з XIV па XVI сталецьце вядома больш, як 80; кніг старога друку з усімі асаблівасьцямі цяперашняе беларускае мовы за адно XVI сталецьце налічваецца больш за 30 (Я. Лёсік).

*Запішыце тэкст у адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы.*

***Практыкаванне 7.*** *Перакладзіце тэкст на беларускую мову.*

Русский язык – самый распространённый представитель восточнославянской языковой группы не только по числу говорящих на нём, но и по количеству стран, в которых он используется для ежедневного общения.

Русский язык признан национальным языком русского народа; государственным языком Российской Федерации; одним из языков для межнационального общения в странах постсоветского пространства, Евразии, Восточной Европы; одним из языков международного общения; одним из шести рабочих языков ООН.

Русский язык считают родным свыше 200 миллионов человек, из которых 130 миллионов живут на территории Российской Федерации. 50 миллионов являются носителями языка, причём большинство из этих людей используют его как первый или второй язык в повседневном общении. После китайского и английского (самых распространенных в мире), русским языком в разной степени пользуются полмиллиарда человек.

***Практыкаванне 8.*** *Адзначце правільныя сцвярджэнні.*

1. Беларуская мова, як і англійская, адносіцца да індаеўрапейскай сям'і моў. 2. Беларуская і польская мовы адносяцца да заходняй групы славянскіх моў. 3. Першую пісьмовую мову славян стварылі браты-асветнікі Кірыла і Мяфодзій. 4. Большасць спецыфічных рыс беларускай мовы сфарміраваліся да XIV ст. 5. Найбольшага росквіту старабеларуская мова дасягнула ў XVIII ст. 6. Новая беларуская пісьмовая мова складвалася ў XIX ст. на аснове жывых беларускіх гаворак. 7. Нацыянальная мова мае дзве разнавіднасці – літаратурную і размоўную. 8. Літаратурная мова бытуе ў дзвюх формах – пісьмовай і гутарковай. 9. Беларуская мова мае статус нацыянальнай мовы. 10. Беларуская мова – адзіная дзяржаўная мова ў Рэспубліцы Беларусь.

## ТЭМА 3.
## Лексікалогія як раздзел мовазнаўства

***Практыкаванне 9.*** *Суаднясіце тэрміны ў левым слупку з прыкладамі ў правым. Адказ запішыце.*

| | |
|---|---|
| 1. Мнагазначнае слова | А. *варатар – галкіпер* |
| 2. Сінонімы | Б. *атака – абарона* |
| 3. Антонімы | В. *пазванок – пазваночнік* |
| 4. Амонімы | Г. лыжны *трамплін – трамплін* для новых дасягненняў |
| 5. Паронімы | Д. беленькі *каток – каток* для фігурыстаў |

***Практыкаванне 10.*** *Прачытайце тэкст. Вызначыце, з якім значэннем* (*прамым ці пераносным*) *ужыты ў кантэксце выдзеленыя словы.*

**Футбол**

Гулкая ***асада*** стадыёна.
Ля ўвахода паставы ахрып.
Глухнуць нават трубкі тэлефона.
***Заразіў*** футбол усіх, як грып.
Скаланецца, загрымеўшы ў ладкі,
***Стадыён*** – раскроены ***кавун***.
І вось-вось, здаецца, як зярняткі,
Выпрыснуць балельшчыкі з трыбун.
Скок – ігрок, і ў мяч ілбом да болю…
Дзе ты, шарык? Ты – ізноўку свой!
Пасвятлелі думкі аб футболе –
Бач, і тут ***працуюць галавой***.
Тут адно у ног ***улады*** многа,
Рук сваіх жа ***бойся***, як біча,
Бо караюць суддзі вельмі строга
За ***рукапрыкладства*** да мяча.
Нехта к брамцы вырвецца знянацку:
Бу́хайце,
Балельшчыкі, у званы!
Толькі гулка чокнуцца па-брацку
Два ***шары*** – футбольны і зямны.
Натрэніраваным бумерангам
Пстрыкнуў мяч – хоць плач ці закрычы.
Варатар, нібы апостал рангам:
Не ўпускае грэшныя мячы.
Сам свісток судзейскі ***заскандаліў*** –
Свіснуў іграку, як штрафніку.
Воплескі, як тысяча медаляў,
Выслізнуўшы, грымнулі ўбаку.
Галава закружыцца ад звону,
Як ад хмелю.
Але пі да дна
Трапяткую ***чашу*** стадыёна,
Як бы горкай ні была яна!
(П. Макаль)

***Практыкаванне 11.*** *Перакладзіце выказванні на беларускую мову. Растлумачце, якім чынам дасягаецца камічны эфект.*

1) Именитый пловец забросил бассейн: все последние годы уже купался в славе. 2) Тренер не хватал звезд с неба. Он их переманивал у соседней команды. 3) Тренер по плаванию уходил в работу с головой. 4) Мало родиться в рубашке, надо еще и в майке лидера! 5) Гандболисты должны хорошо потрудиться, чтобы мяч стал ручным! 6) Бег по инстанциям все чаще становится марафонским.

***Практыкаванне 12.*** *Запішыце словазлучэнні, выбіраючы ў дужках неабходнае слова.*

(Зімні, зімны, зімовы) від спорту; (абяссілец, абяссіліць) на фінішы, (адборачны, адборны) тур; (афіцыйныя, афіцыёзныя) спаборніцтвы; (ганарлівае, ганаровае, ганарыстае) званне; (гоначны, гончы) аўтамабіль; (камбінаваная, камбінацыйная) эстафета; (класічны, класны) лыжны ход; баксёрскі (раўнд, раўт); (стральба, стрэльба) па рухомай мішэні.

***Практыкаванне 13.*** *Прачытайце тэкст. Вызначыце яго тэму і асноўную думку.*

У адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 32 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі абавязаны клапаціцца пра сваё здароўе, імкнуцца да маральнага, духоўнага і фізічнага развіцця і самаўдасканалення. У гэтых мэтах ва ўстановах адукацыі арганізуюцца і праводзяцца спартыўна-масавыя і фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы. Названыя мерапрыемствы заклікаюць вырашаць наступныя

задачы: стварэнне ўмоў для аздараўлення навучэнцаў сродкамі фізічнай культуры і спорту; уцягванне школьнікаў у сістэматычныя заняткі фізічнай культурай і спортам; адбор перспектыўных і таленавітых у відах спорту навучэнцаў, якім рэкамендуюцца заняткі ў спецыялізаваных вучэбна-спартыўных установах; цеснае ўзаемадзеянне з установамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, спецыялізаванымі вучэбна-спартыўнымі ўстановамі па фарміраванні здаровага ладу жыцця вучняў сродкамі фізічнай культуры і спорту. Установы агульнай сярэдняй адукацыі забяспечваюць ахову здароўя навучэнцаў, якая ўключае ў сябе прапаганду і навучанне навыкам здаровага ладу жыцця, арганізацыю аздараўлення, стварэнне ўмоў для заняткаў фізічнай культурай і спортам («Метадычныя аспекты ўдасканалення выхаваўчай работы ў шосты школьны дзень»).

*Запішыце:*

✧ *словы, якія ў тэксце маюць значэнне: а) ‘фізічныя практыкаванні для развіцця і загартоўкі арганізма’, б) ‘правільная, нармальная дзейнасць арганізма’*;

✧ *значэнне, з якім у тэксце ўжыта слова* ***лад****: ‘дзяржаўная ці грамадская сістэма’*; *‘згода, парадак’*; *‘уклад, спосаб’*;

✧ *10 слоў, якія ўваходзяць у тэматычны рад* ***віды спорту***;

✧ *сінонімы да слова* ***вучні****, ужытыя ў тэксце*;

✧ *антонімы да слоў* ***маральны****,* ***перспектыўны****,* ***стварэнне***;

✧ *тэрмін, якім можна назваць пару слоў* **спецыялізаваны – спецыяльны**.

*Адкажыце*:

✧ *з прамым ці пераносным значэннем ужыты прыметнікі ў спалучэннях:* ***цеснае*** *ўзаемадзеянне,* ***фізічная*** *культура,* ***таленавіты*** *навучэнец,* ***здаровы*** *лад жыцця*?

✧ *ці з’яўляюцца сінонімамі словы* ***дзеці*** *і* ***моладзь?***

✧ *ці можна замяніць слова* ***сістэматычныя*** *словам* ***сістэмныя***?

## ТЭМА 4.
## Лексіка беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання

***Практыкаванне 14.*** *Запішыце беларускія адпаведнікі тэрмінаў іншамоўнага паходжання. Патлумачце, як засвоены гэтыя словы беларускай мовай.*

*Англ*. outsider, trainer; *грэч*. athletike, stadion; *франц*. médaille, piedestal, tableau; *нямецк*. Turnier, Stange; *італьянск*. finale.

***Практыкаванне 15.*** *Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго спрадвечна беларускія і запазычаныя словы спецыяльнай лексікі, назавіце прыметы запазычанасці.*

*Падкрэсліце назвы відаў спорту. Якія з відаў спорту застаюцца алімпійскімі і ў наш час?*

Найбольш знакамітымі і вядомымі спартыўнымі спаборніцтвамі, якія адначасова былі яшчэ фактычна і агульнаэлінскім святам, у Старажытнай Грэцыі былі Алімпійскія гульні. Яны былі ўпершыню праведзены ў 776 г. да н. э. у г. Алімпія на паўвостраве Пелапанес, і з таго часу адбываліся там адзін раз у 4 гады на працягу 5 дзён у канцы чэрвеня–пачатку ліпеня. Менавіта па гэтых 4-гадовых цыклах – Алімпіядах – эліны вялі сваё летазлічэнне. На час правядзення Алімпійскіх гульняў заключаўся так званы «свяшчэнны мір» і спыняліся баявыя дзеянні. Да ўдзелу ў гульнях дапускаліся толькі свабодныя грэкі, якія прадстаўлялі ўсе грэчаскія гарады-дзяржавы. У праграму былі ўключаны розныя віды спорту: пентатлон – пяцібор’е, якое ўключала бег, барацьбу, кіданне дыску і кап’я, скачкі ў даўжыню; бег розных тыпаў, барацьбу, кулачны бой, конныя спаборніцтвы на калясніцах. Пазней быў уведзены «панкратый» – своеасаблівае спалучэнне барацьбы і кулачнага бою, у якім дазвалялася прымяненне любых прыёмаў, акрамя свядомых удараў у вочы саперніка. Пераможца гэтых гульняў – алімпіёнік – меў вялікую пашану і сацыяльныя прывілеі – вызваленне ад падаткаў, пажыццёвая пенсія, лепшыя месцы ў тэатры і на святах. У яго гонар складаліся гімны. Тройчы чэмпіён Алімпійскіх гульняў замаўляў у знакамітага скульптара сваю статую, якую ставілі ў свяшчэнным гаі каля галоўнай святыні горада Алімпія і ўсёй Грэцыі – храма Зеўса (Э. Дубянецкі).

***Практыкаванне 16.*** *Дапоўніце схему прыкладамі.*




***Практыкаванне 17.*** *Запішыце прапанаваныя словы ў два слупкі: 1) прафесіяналізмы, 2) тэрміны. Растлумачце, чым вы кіраваліся пры размежаванні слоў.*

***Балалайка*** ‘ў футболе – мяч, які ўдарыўся ў перакладзіну, потым аб зямлю і адскочыў у вароты’, ***банан*** ‘у баскетболе – блок-шот’, ***вароты*** ‘строга акрэсленая і вылучаная частка прасторы на полі, якая абараняецца кожнай камандай’, ***гонка*** ‘спаборніцтва ў хуткасці язды, бегу, плавання і пад.’, ***гульня*** ‘занятак з мэтай забавы, адпачынку і пад., звычайна заснаваны на пэўных умовах, правілах’, ***дыспетчар*** ‘у футболе – ігрок, які кантралюе ігру сваёй каманды’, ***домік*** ‘прамежак паміж шчыткамі хакейнага варатара’, ***канёк*** ‘каньковы ход у лыжным спорце’, ***канькі*** ‘вузкія сталёвыя палазкі, якія прымацоўваюцца да абутку для катання на лёдзе’, ***карзіна*** ‘сетка на абручы, у якую закідваюць мяч’, ***клюшка*** ‘палка з загнутым канцом для гульні ў хакей’, ***коўчыць*** ‘трэніраваць’, ***лыжы*** ‘плоскія драўляныя

загнутыя спераду палазы, якія прымацоўваюць да абутку для перамяшчэння па снезе’, ***матч смерці*** ‘матч, пройгрыш у якім асуджае каманду на выбыццё з далейшай барацьбы’, ***мяч*** ‘зроблены з пругкага матэрыялу шар для гульні, які адскаквае пры ўдары аб цвёрдую паверхню’, ***накалаціць*** ‘забіць шмат галоў у вароты саперніка’, ***падача*** ‘ўдар па мячу, шайбе і пад., які ўводзіць апошнія ў гульню’, ***паравоз*** ‘група спартсменаў, якія бягуць разам у кросе’, ***свяча*** ‘мяч уверх’, ***судзіць*** ‘сачыць за выкананнем правілаў гульні і вырашаць спрэчкі’.

***Практыкаванне 18.*** *Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Вызначыце яго тэму і ідэю.*

*Падкрэсліце адной рыскай тэрміны, дзвюма – прафесіяналізмы. Растлумачце іх значэнне.*

Помните прошлогодний этап Кубка мира в Хохфильцене, когда вместо того, чтобы стрелять из положения лёжа, Даша Домрачева стала пулять по мишеням стоя? Напортачила Даша со стрельбой и в шведском Эстерсунде.

Что подвигло Домрачеву на втором огневом рубеже «индивидуалки» выстрелить первую пулю по соседней мишени, не знает и она сама. К счастью, вовремя сообразила и остальные четыре патрона ушли точно в цель. Один «кружок» при этом остался не закрыт, но судьи засчитали Даше две штрафные минуты. Как если бы Домрачева не произвела пятый выстрел вовсе.

В итоговом протоколе ее фамилия долго висела за пределами первой десятки, но потом неожиданно для всех поднялась на третью строчку.

Восторжествовала справедливость. Клаус Зиберт после окончания гонки обратил внимание рефери на неточность. Лишнюю штрафную минуту у белоруски сняли (по С. Канашицу).

## ТЭМА 5.
## Паняцці «тэрмін», «тэрміналогія», «тэрміналагічная сістэма». Тэрміны фізічнай культуры і спорту

***Практыкаванне 19.*** *Прачытайце ў левым слупку тэрміны фізічнай культуры і спорту, якія прапанаваліся ў 1920-я гг. Знайдзіце ў правым слупку іх сучасныя адпаведнікі. Запішыце суадносныя пары слоў.*

| | |
|---|---|
| коўзанка | вуглавы |
| нарожны | веласіпедыст |
| вадазбор | шашкі |
| самакатчык | спаборніцтвы |
| арцабы | фінал |
| выпярэдніцтва | каток |
| разьвязка | педалі |
| панажы | басейн |

***Практыкаванне 20.*** *Прачытайце тэрміны. Аб'яднайце іх у тры групы: 1) адзінаборствы, 2) спартыўныя гульні, 3) іншыя віды спорту. Вызначыце значэнне тэрмінаў адной з груп. Ахарактарызуйце спосаб утварэння тэрмінаў*

Абводка, алюр, афсайд, багі, буліт, блакіравацъ, брас, гейм, гол, жакей, забег, кімано, лыжы, мішэнь, навес, накаўт, рэгата, сальта, спрынтар, стопер, тайм, тодас, трэк, тушэ, укол, форвард, хват, цір, шайба, шпагат.

***Практыкаванне 21.*** *Вызначыце, якая частка слова аб'ядноўвае прыведзеныя тэрміны-англіцызмы. Якое значэнне мае гэтая частка ў англійскай мове?*

1) баскетбол, бейсбол, валейбол, футбол;
2) гандбол, форхенд, бекхенд;
3) афсайд, інсайд, аўтсайдар;
4) красмен, рэкардсмен, лайнсмен, яхтсмен;
5) аўт, аўтсайдар, тайм-аўт.

***Практыкаванне 22.*** *Вызначыце, з якой мовы запазычаны тэрміны. Праверце свой адказ па слоўніку. Назавіце прыметы запазычанасці.*

1) аэробіка, перыяд, стадыён, алімпіяда;
2) канкур, манеж, акрабат, віраж;
3) гантэль, рапіра, эндшпіль, кеглі;
4) батут, рэгата, фаварыт, фора;
5) дзюдо, каратэ, кімано, татамі.

***Практыкаванне 23.*** *Прачытайце тэрміны, на іх аснове запоўніце табліцу.*

| Тэрміны ўтвораны | | |
|---|---|---|
| суфіксальным спосабам (у тым ліку з дапамогай нулявога суфікса) | сінтаксічным спосабам | лексіка-семантычным спосабам (тэрміналагізацыя) |
| | | |

Абруч, барацьба, бег, бег з бар'ерамі, водны слалам, дарожка, допуск, дыван, заплыў, кідок, мастацкая гімнастыка, настольны тэніс, стужка, падсечка, прызямленне, размінка, сетка, скарасны спуск, удар, укол.

***Практыкаванне 24.*** *Назавіце адным словам.*

1) бег на кароткія дыстанцыі, 2) становішча па-за гульнёй, 3) змешаная пара ў тэнісе, 4) бягун на сярэднія дыстанцыі, 5) бег з перашкодамі, 6) спартыўны калектыў, 7) хакей з мячом на лёдзе, 8) павольны бег для здароўя, 9) двухмесны веласіпед, 10) гімнастычны абруч.

***Словы для даведак***: афсайд, бендзі, джогінг, каманда, мікст, мітэльштрэкер, спрынт, стыпль-чэз, тандэм, хулахуп.

***Практыкаванне 25.*** *Ад дзеясловаў утварыце тэрміны-назоўнікі.*

Абвесці, авалодаць, захапіць, кідаць, па́даць, пада́ць, паскарацца, перавярнуцца, разбегчыся, рухацца, слізгаць, тармазіць, укідваць, фіксаваць, штурхаць.

***Практыкаванне 26.*** *Тэрміналагічны практыкум.*

✧ *Назавіце тэрміналагічнае значэнне слоў:*

*Дыстанцыя – гэта...* 1) участак адміністрацыйна-тэхнічнага падзелу чыгуначнага, шасейнага і воднага пуці, 2) адлегласць паміж стартам і фінішам, 3) спецыяльная кругавая дарожка на стадыёнах і катках і пад., на якой праводзяцца трэніроўкі і спаборніцтвы.

*Камбінацыя – гэта...* 1) спалучэнне, злучэнне, узаемна абумоўленае размяшчэнне якіх-небудзь прадметаў, з'яў, 2) хітрыкі, загадзя абдуманы манеўр для дасягнення карыслівай ці іншай нядобрай мэты, 3) рад прыёмаў гульні, аб'яднаных агульнай мэтай – дасягнуць перавагі, перамогі.

*Спаборніцтва – гэта...* 1) схватка двух, з якіх кожны імкнецца перамагчы другога, 2) імкненне перамагчы, 3) форма дзейнасці, пры якой удзельнікі імкнуцца выявіць перавагу над кім-небудзь.

✧ *Вызначыце спосаб утварэння тэрмінаў **перыяд**, **матч**, **спартсмен**, **матч-рэванш**. Знайдзіце чацвёртае лішняе.*

***Практыкаванне 27.*** *Складзіце крыжаванку «Алімпійскія віды спорту».*

***Практыкаванне 28.*** *Высветліце, якое значэнне маюць спартыўныя тэрміны **аўтсайдар**, **рэйтынг**, **допінг**, **пешка**, **накаўт**, **гамбіт**, **ракіроўка**, **тайм-аўт** па-за межамі тэрміналагічнай сістэмы. Прывядзіце прыклады ўжывання гэтых слоў у сродках масавай інфармацыі.*

***Практыкаванне 29.*** *Прачытайце адзін з тэкстаў (згодна абранаму віду спорту), змешчаных у Дадатку 1. Знайдзіце тэрміны, запоўніце табліцу.*

| Тэрмін | Значэнне | Спосаб утварэння |
|---|---|---|
| | | |

## ТЭМА 6.
## Паняцце білінгвізму. Моўная інтэрферэнцыя і яе віды. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны іх парушэння.

***Практыкаванне 36.*** *Прачытайце словы, захоўваючы акцэнталагічныя і арфаэпічныя нормы беларускай мовы.*

Абруч, агент, адсеяць, адстраляцца, адштурхоўванне, акваланг, атлет, афсайд, бег, буйны, булава, віндсёрфінг, выездка, выпад, вясло, дуга, дыван, лагер, легенда, лёгкі, лодка, манеж, падножка, прабежка, плывец, рэферы, свісток, спіна, статут, стральба, стужка, суддзя, сцяг, форсінг, цяжар, цяжкі.

*Якія з прыведзеных слоў з’яўляюцца: а) прафесіяналізмамі; б) тэрмінамі* (*укажыце від спорту*)*, в) кампанентамі тэрмінаў-словазлучэнняў?*

***Практыкаванне 37.*** *Прачытайце частагаворкі: спачатку па складах, потым не спыняючыся, а затым – бегла. Сачыце за выразнасцю вымаўлення гукаў.*

Дзесяціборац Дзяніс удала кінуў дыск.
Міша з Сашам гулялі ў шашкі.
У Соні і Сані сані беглі самі.
Бяры абруч абяруч, а не аднаруч.
Барыс скокнуў галавой уніз.

***Практыкаванне 38.*** *Прачытайце тэкст. Вызначыце яго тэму і асноўную думку. Выпішыце: 1) словы з адметнымі беларускімі гукамі; 2) словы, у якіх не супадаюць вымаўленне і напісанне.*

Здароўе людзей, развіццё фізічнай культуры і спорту абвешчаны ў Беларусі прыярытэтным напрамкам сацыяльнай палітыкі.

Штогод у Беларусі для прыхільнікаў здаровага ладу жыцця праводзяцца больш як 16 тысяч спартыўных мерапрыемстваў. Традыцыйнымі сталі фізкультурна-спартыўныя спаборніцтвы «Беларуская лыжня», Усебеларускае фізкультурна-спартыўнае свята, прысвечанае Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Усебеларускі лёгкаатлетычны крос на прызы газеты «Советская Белоруссия». Адроджана сістэма рэспубліканскіх галіновых спартакіяд. У краіне праводзяцца рэспубліканскія спаборніцтвы сярод дзяцей і падлеткаў па футболе «Скураны мяч», гандболе «Імклівы мяч», біятлоне (лыжных гонках і стральбе з пнеўматычнай зброі) «Снежны снайпер», а таксама агульнанацыянальны хакейны турнір на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба «Залатая шайба».

Асаблівая ўвага ўдзяляецца ўдасканаленню фізічнага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі. Па ўсёй краіне для іх арганізуюцца падлеткавыя спартыўныя клубы. У Беларусі працуюць навучальныя цэнтры для падрыхтоўкі прафесійных спартсменаў, у тым ліку Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры, вучылішчы алімпійскага рэзерву, спецыялізаваныя школы алімпійскага рэзерву, больш як 250 дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ (http://olekshicy.berestovica.edu.by).

*Прапануйце назву для спаборніцтваў сярод дзяцей і падлеткаў па тым відзе спорту, якім займаецеся.*

***Практыкаванне 39.*** *Прачытайце верш, захоўваючы арфаэпічныя нормы беларускай мовы.*

**Да адкрыцця першынства Еўропы па футболе 2012 года**

Футбол – круглы,
і заўсёды пачынаецца
з цэнтра
пераможцамі і пераможанымі.
Непрыручаны мяч

гойсае ў аточаным полі,
быццам гнаны сабака,
адскокваючы ад кожнага,
хто замахваецца на яго;
ён стараецца прашмыгнуць
наўзбоч брамніка,
каб стомлена закалыхацца
ў шырокім гамаку
асірацелых варот…
Г-О-О-О-Л!!! –
Голас,
Выпушчаны
са статысячных
луджаных горлаў
заўзятараў,
зрывае павуту з кутоў
то
тых,
то
гэтых
варот,
каб мяч зноў быў
пастаўлены
ў цэнтр увагі
ўсяго чалавецтва.
І свет бачыць,
як Крыштыяну Раналда
забівае мячы з усёй сур'ёзнасцю,
а Марыё Балатэлі –
блазнуе,
ён яшчэ не забыў,
што футбол –
гэта гульня… (Л. Галубовіч)

*Назавіце тэрміны, ужытыя аўтарам верша. Якое слова ў якасці тэрміна не замацавалася, які сінанімічны яму тэрмін ужываецца часцей.*

***Практыкаванне 40***. *Перакладзіце выказванні на беларускую мову і запішыце. Прачытайце адно і тое ж выказванне на рускай і беларускай мовах. Сачыце за правільным вымаўленнем гукаў.*

*Назавіце, якія віды спорту і якія краіны праславілі аўтары прыведзеных выказванняў.*

1) Спорт не воспитывает характер, а выявляет его (Хейвуд Браун). 2) Ни один удар, кроме солнечного, не должен оставаться без ответа (Мухамед Али). 3) Если ты устаешь от ходьбы – беги (Тайгер Вудс). 4) Рекорды существуют для того, чтобы их бить! (Майкл Фелпс). 5) Я знаю только один способ одержать победу – играть головой и сердцем (Джанлуиджи Буффон). 6) Пока у тебя есть попытка – ты не проиграл! (Сергей Бубка). 7) Стать чемпионом намного проще, чем удержать этот титул и прожить с ним всю жизнь (Рой Джонс). 8) А в спорте тот, кто хочет добиться убедительных побед, обязан пытаться прыгнуть выше головы (Лев Яшин). 9) В борьбе ты отвечаешь сам за себя, а в игровых видах спорта отвечает коллектив, и ты отвечаешь за всех. В борьбе если пофилонишь, тут же очутишься на лопатках (Александр Медведь).

***Практыкаванне 41***. *Тэрміналагічны практыкум.*

✧ *Суаднясіце тэрміны* ***паражэнне***, ***нічыя***, ***перамога*** *з прыведзенымі азначэннямі:* 1) такі вынік гульні, барацьбы і пад., калі ні адзін з праціўнікаў не выйграе; 2) поспех у спартыўным спаборніцтве; 3) няўдача, пройгрыш у гульні, барацьбе.

✧ *Вызначыце спосаб утварэння тэрмінаў.*

✧ *Назавіце спецыфічныя рысы беларускай фанетыкі, якія адлюстраваны ў тэрмінах.*

***Практыкаванне 42***. *Запішыце прапанаваныя лексічныя адзінкі ў алфавітным парадку. Вызначыце колькасць літар і гукаў у выдзеленых словах.*

***Біятлон***, шахматы, бокс, гімнастыка, слалам, хакей, карцінг, барацьба, авіямадэлізм, футбол, віндсёрфінг, ***фітнес-ёга***, бег, бабслей, скелетон, аўтамадэлізм, ***плаванне***, спідвей, веславанне, канкур-іпік, ***дзюдо***, самба, слалам-гігант, сёрфінг, ***пяцібор'е***, судамадэлізм, каратэ, акрабатыка.

***Практыкаванне 43.*** *Запішыце словы ў адпаведнасці з беларускім правапісам.*

[трохбóрйэ], [п'эраадóл'эн̄'э], [йóга-спорт], [ал'імп'ійáда], [пóдз'в'іх], [баск'эдбóл], [снаўбóрдынх], [на дарóсцы], [г'эрайі́чны], [паўэрл'і́фтынх], [абаран'áйэс̄'а], [ав'ійатэ́хн'іка], [джып-трыйáл].

***Практыкаванне 44.*** *Спішыце тэкст. Устаўце прапушчаныя літары. Растлумачце іх правапіс.*

У выніковым спісе канд...датаў на прав...дзе...е летніх Алімпійскіх гульняў, якія пройдуць у 2024 годзе, ч...тыры еўрапейскія і адзін амерыканскі горад: Пары..., Рым, Будапешт, Гамбур... і Лос-Андж...лес.

Канчатковае рашэ...е на карысць аднаго з гарадоў прымуць у 2017 годзе. Арганізацыйнаму каміт...ту летніх Алімпійскіх гульняў МАК выдзеліць на падрыхтоўку 1,7 мільярда долараў. Месцы прав...дзе...я наступных ч...тырох – д...вюх зімовых і д...вюх летніх Алімпіяд – ужо распісаны. У 2016 годзе галоўны турнір ч...тырохго...я прыме бразільскі Ры...-дэ-Жанейра. Узімку 2018-га эстафету падхопіць п...ўднёвакарэйскі Пхенчхан. У 2020 годзе летнія Гульні пройдуць у ст...ліцы Японіі Токі..., а ў 2022 годзе зімовую Алімпіяду прыме ст...ліца Кітая П...кін («Звязда»).

***Практыкаванне 45***. *Запішыце словы ў адпаведнасці з прыведзенымі значэннямі. Сфармулюйце правіла, паводле якога пішуцца гэтыя словы.*

*З запісанымі словамі складзіце тэкст.*

1. Комплекснае спартыўнае збудаванне з футбольным полем, бегавымі дарожкамі, пляцоўкамі для спаборніцтваў і трэніровак, трыбунамі для гледачоў. 2. Пераможца ў спартыўных спаборніцтвах, гульнях на першынство, а таксама асоба або каманда, удастоеныя такога звання. 3. Спаборніцтва на званне чэмпіёна ў якім-небудзь відзе спорту або ў спартыўных гульнях. 4. Масавае спаборніцтва спартыўных каманд і таварыстваў па розных відах спорту. 5. Спартсмен, які спецыялізуецца ў бегу ці гонках на доўгія дыстанцыі. 6. Спецыяльна падабраны па колькасці, хімічным складзе, каларыйнасці і кулінарнай апрацоўцы рацыён харчавання. 7. Спартыўныя спаборніцтвы, дзе лыжная гонка спалучаецца са стральбой з вінтоўкі на некалькіх агнявых рубяжах. 8. Пэўны адрэзак гульнёвага часу ў хакеі. 9. Міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы, якія праводзяцца раз у чатыры гады. 10. Спартсмен ад 18 да 20 гадоў, які ўдзельнічае ў спаборніцтвах сваёй узроставай групы.

*Праверце правільнасць выканання задання* (*ключ змешчаны ў Дадатку 2*).

***Практыкаванне 46***. *Прачытайце тэкст. Запоўніце табліцу прыкладамі з тэксту.*

| Напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе правапісу | Напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе правапісу |
|---|---|
| | |

Асноўныя прафесійныя кампетэнцыі, якімі павінен валодаць выпускнік факультэта фізічнай культуры:

✧ набываць новыя веды, выкарыстоўваючы сучасныя тэхналогіі;

✧ арганізоўваць і якасна праводзіць заняткі па фізічным выхаванні навучэнцаў, спартыўнай трэніроўцы, аздараўленчай фізічнай культуры і турызму;

✧ умець правільна нарміраваць нагрузкі на фізкультурна-аздараўленчых і спартыўных занятках з улікам стану здароўя, узросту, полу і падрыхтаванасці навучэнцаў;

✧ планаваць і ажыццяўляць працэс фарміравання тэхнікі рухальных дзеянняў і выхавання фізічных якасцей;

✧ кантраляваць нагрузкі і фізічны стан тых, хто займаецца фізічнай культурай і спортам;

✧ вызначаць эфектыўнасць вучэбна-трэніровачнага працэсу па фізічнай культуры і спорту;

✧ арганізоўваць і весці навучанне настаўніцкага, інструктарскага і трэнерскага персаналу, ажыццяўляць мерапрыемствы па прадухіленні вытворчага траўматызму;

✧ умець вызначаць і ацэньваць функцыянальны стан арганізма;

✧ ведаць формы і метады арганізацыі фізічнага выхавання, фізкультурна-аздараўленчай работы і спартыўнай трэніроўкі;

✧ складаць комплексы фізічных практыкаванняў і сродкаў здаровага ладу жыцця (загартоўвання, рацыянальнага харчавання, псіхаэмацыйнай рэгуляцыі, рацыяналізацыі рэжыму працы і адпачынку);

✧ валодаць тэхнікай судзейства спартыўных спаборніцтваў на ўзроўні масавага спорту;

✧ прымяняць метады і сродкі правядзення метадычнай працы ў галіне фізічнай культуры і спорту (http://www.grsu.by).

***Практыкаванне 47***. *Спішыце сказы, устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя літары. На марфалагічным ці фанетычным прынцыпе заснаваны правапіс гэтых арфаграм?*

Армрэ́слін... – від а...інаборства, пры якім с...пернікі, што стаяць адзін насупраць аднаго, са...чапіўшыся кіс...цямі, імкнуцца палажыць пастаўленую на локаць руку іншага.

Айкідо́ – від усходняга баявога маста...ва, сутнас...ць якога заключаецца ў спалучэ... і бара...ьбы з выкарыста...ем бі...эн...ргетычных ма...чымас...цей арганізма.

А...тамотатуры́зм – від турызму – падаро...а на аўтамабілях або матацыклах.

Дры́блінг – у некаторых відах спорту (фу...бол, хак...ей, баске...бол і пад.) майст...рскае валода...е м...чом (шайбай), адзін з асноўных т...хнічных прыёмаў нападзе...я.

Інт...рнэ́т-ка́рт...нг – камп...ют...рная гульня – гонкі за рулём віртуальнага міні-а...тамабіля.

Бо...іста́йлінг – сіст...ма практыкава...яў для паляпшэ...я фігуры.

Вел...тр...нажо́р – спарт...ўны тр...нажор у выглядзе веласіпеда, прызначаны для тр...ніроўкі мышцаў но... .

Піла́т...с – комплекс фізічных практыкава...яў, накіраваных на расця...ку і распрацоўку гл...бокіх мышцаў, развіц...ё гнуткасці суставаў, эласт...чнасці з...вязак і г. д.

Сава́т – францу...кі бокс, у якім дазволена бара...ьба нагамі.

***Практыкаванне 48***. *Перакладзіце спартыўныя тэрміны на беларускую мову. Пераклад запішыце.*

*Растлумачце па ўзоры значэнні перакладзеных лексічных адзінак* (*пры неабходнасці карыстайцеся даведкай*).

***Узор***

*Да́йвинг – да́йвінг – падводнае плаванне са спецыяльнай амуніцыяй.*

Алтима́т, сноубо́рд-кросс, легионе́р, бодифле́кс, тю́бинг, дрэ́гстер, лыжеро́ллеры, аутса́йдер, гранд-чемпио́н, индорхокке́й, бо́улинг, ре́стлинг, бейсджа́мпинг, велотриа́л, пауэрли́фтинг, ску́тер, ра́лли-ре́йд, авиашо́у.

***Даведка***

*разнавіднасць прафесійнай барацьбы, якая выкарыстоўвае прыёмы вольнай барацьбы і дзюдо;
*збіванне 10 вялікіх кегляў драўлянымі шарамі на спецыяльнай дарожцы, абгароджанай борцікамі;
*спаборніцтвы па пераадольванні перашкод (прыродных ландшафтаў, бездарожжа, абрываў і пад.);
*сілавое трохбор'е, куды ўваходзяць жым лежачы дзвюма рукамі, прысяданне са штангай і падыманне штангі ад падлогі;
*той, хто адстае ад іншых у якой-небудзь справе ці сферы дзейнасці;
*аднамесны матацыкл;
*кіданне пластыкавага дыска (фрысбі або пад.) па пэўных правілах удзельнікамі дзвюх каманд;
*экстрэмальны від спорту – скачкі з вышынных будынкаў, мастоў і іншых аб'ектаў з выкарыстаннем спецыяльнага парашута;
*дыхальная гімнастыка ў спалучэнні з фізічнымі практыкаваннямі для паляпшэння фігуры;
*найвышэйшая ўзнагарода на спаборніцтвах;
*спецыяльны аўтамабіль або матацыкл, прызначаны для парных лінейных (па прамой, на кароткія дыстанцыі) гонак;
*гульня ў хакей з мячом у спецыяльным закрытым памяшканні (на пляцоўцы для гандбола);
*спартсмен, які выступае ў замежных клубах, камандах па кантракце;
*спартыўны інвентар, які складаецца з лыжаў і ролікаў, для катання па асфальтавым пакрыцці;
*святочнае мерапрыемства з удзелам авіятэхнікі;
*шматэтапныя спартыўныя спаборніцтвы аўтамабіляў на доўгіх дыстанцыях;
*групавая хуткасная гонка на снаўбордах з пераадоленнем трамплінаў і віражамі;
*экстрэмальны від зімовага спорту – спуск з гары на спецыяльных некіруемых санях па трасе ў выглядзе жолаба.

***Практыкаванне 49***. *Прачытайце тэкст, вызначыце яго асноўную думку.*

*Запішыце тэкст па-беларуску ў адпаведнасці з прынцыпамі і напісаннямі беларускай арфаграфіі.*

Система игр в Древней Греции не ограничивалась только Олимпиадами. Вторыми по значению были Пифийские игры, проходившие при храме Аполлона Пифийского в Дельфах на Криссейской равнине, у подножия горы Парнас. По определению, они были учреждены самим Аполлоном после победы над змеем Пифоном. Первоначально Пифийские игры проводились один раз в 4 года, начиная с VI века до н.э. На это время устанавливалось, как и во время Олимпиад, священное перемирие. В Пифийские игры были включены соревнования атлетов и состязания на колесницах. Если в Олимпии победители награждались венком из ветви оливы, то здесь – из лавра, который считался священным деревом Аполлона. Древний историк Геродот свидетельствует, что персы изумлялись непоколебимому мужеству греков, которые систематически воспитывали у юношей патриотизм, стойкость в бою («Белорусский олимпийский учебник»).

## ТЭМА 7.
## Гісторыя развіцця графічнай сістэмы

***Тэставае заданне.*** *Па кожным пытанні выбірыце правільны варыянт(варыянты) адказу.*

**1.Што абазначае слова “графіка”?**

A. Сістэму пісьмовых знакаў пэўнай мовы;

B. Слоўнікавы склад мовы;

C. Сістэму фанетычных сродкаў, звязаных з вышынёй, сілай, працягласцю;

D. Раздзел мовазнайства, у якім вывучаецца сукупнасць усіх сродкаў для абазначэння вуснай мовы на пісьме.

**2. Якія існуюць віды пісьма ?**

A. Прасадычнае; D. Фанетычнае;

B. Літарна-гукавое; E. Піктаграфічнае.

C. Ідэаграфічнае;

**3.Якія народы карыстаюцца фанемаграфічным пісьмом?**

A. Чэхі; D. Літоўцы;

B. Беларусы; E. Англічане.

C. Кітайцы;

**4.На якія літары падзяляецца алфавіт у графічных адносінах?**

A. Надрадковыя; D. Загалоўныя;

B. Падрадковыя; E. Прапісныя.

C. Рукапісныя;

**5.Колькі літар у беларускім алфавіце?**

A. 10 літар для абазначэння галосных, 22 – зычных;

B. 12 літар для абазначэння галосных, 20 – зычных;

C. 12 літар для абазначэння галосных, 22 – зычных;

D. 10 літар для абазначэння галосных, 21– зычных;

**6.Якія беларускія літары і знакі не абазначаюць гукаў?**

A. Дж, дз;

B. Апостраф; E. Ь;

C. Ў;

D. Ъ.

**7. З якімі графічнымі сістэмамі звязана гісторыя беларускага пісьменства?**

A. Лацініцай;

B. Глаголіцай;

C. Вукавіцай;

D. Гаевіцай;

E. Кірыліцай.

**8. Якім алфавітам карысталася старажытная беларуская мова?**

A. Кірыліцкім;

Б. Грэчаскім;

В. Македонскім*;*

*Г. Стараславянскім;*
*Д. Старабеларускім;*
*Е. Стараруськім.*

## ТЭМА 8.
## Прынцыпы і нормы беларускай арфаграфіі

***Практыкаванне 50***. *Спішыце, устаўце прапушчаныя літары **ў, у**. Растлумачце іх правапіс.*

А...т, а...таралі, а...тсайдар, байк-шо..., бо...лінг-клуб, ваку...м-фільтр, індывіду...м, кра...ч ‘нізкая стойка пры спусках у лыжным спорце’, ла...ры, ла...н-тэніс, ма...нтба́йк, моцны ...ціск, нака...т, накда...н, на ...ніверсіядзе, па...эрліфтынг, рады...с, ра...нд, сна...борд, тайм-а...т, традыцыйна-...рачысты, ха...бек, ха...тайм.

***Практыкаванне 51.*** *Запішыце тэкст у адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі беларускай мовы. Знайдзіце ў тэксце адназначныя і мнагазначныя словы. Праверце правільнасць выканання задання па тлумачальным слоўніку.*

Табе кане...не даводзілася чуць што р...дзіма ха...ея (К,к)анада. Сапраўды першы афіцыйны ха...ейны ма...ч а...быўся ў 1879 г. у «Краіне кл...новага ліста» (кл...новы ліст выяўлен...ы на кана...кім дз...ржаўным сцягу). Але ж і ў таго першапачатковага ха...ея былі выток і.

Гульні якія нагадвалі ха...ей існавалі са старажытных часоў. Такую гульню ведалі ў Кіта... яшчэ ч...тыры з паловай тыс...чы гадоў наза... . Ха...ейнымі па...дынкамі захапляліся і старажытныя ін...ейцы. Све...чаннем гэтаму з...яўляюцца фрэскі якія экспануюцца ў (Н,н)ац...нальным антрапалагічным музе... (М,м)ехіка. На іх выяўлены спар...смены якія гуляюць у невялікі шар сагнутымі палкамі. Некаторыя крыніцы с...вярджаюць што нара...энне ха...ея з шайбай ...вязана з жы...ём ін...ейцаў (К,к)райняй (П,п)оўначы (А,а)мерыкі. У аналагічныя ж гульні ў (Е,е)ўропе гулялі ўжо ў XVI ст. Галан...цы напрыклад лічаць што менавіта іх краіна з...яўляецца р...дзімай ха...ея.

Калі ж ...вярнуцца да м...ваведаў то яны пав...дамяць што слова «ха...ей» францу...скага паходжання. «Хокэ» так на францу...скай мове гучыць назва посаха пастухоў з загнутай ручкай.

Бачыш як лё...ка заблытацца ў пошуках заснавальнікаў любімай гульні (паводле А.Ісаева).

*Праверце правільнасць выканання задання* (*ключ змешчаны ў Дадатку 2*).

***Практыкаванне 52***. *Спішыце тэкст. Устаўце прапушчаныя літары, растлумачце іх правапіс.*

*Выпішыце з тэксту тэрміны фізічнай культуры і спорту, растлумачце іх значэнне.*

Спорт (англ. *sport*) – саста...ная частка фізічнай кул...туры, сродак і метад фізічнага выхавання, які мае на мэце развіццё і ...мацаванне арганізма чалавека, дасягненне ім высокіх вынікаў у спаборніцтвах; сістэма арганізацыі і правядзення спаборніцтваў і вучэбна-трэніровачных заняткаў па розных комплексах фізічных практыкаванняў. Асно...ныя арганізацыйныя формы спорту – масавы самадзейны спорт, спорт вышэйшых дасягненняў і спорт як вучэбны прадмет.

Фізічная культура і спорт – неад...емная частка культуры грама...ства і кожнага чалавека. Рэгулярныя фізічныя трэніро…кі рэзка паніжаюць захворванне насел...ніцтва, стано...ча ўплываюць на псіхіку чалавека, на яго ўважлівасць, памяц..., мысленне, спрыяюць эфектыўнаму выхаванню асабістых якасцей – настойлівасці, волі, мэтанакіраванасці, калектывізму, камунікабел...насці, працаздол...насці, выпрацо...ваюць акты...ную пазіцыю. Спорт дапамагае людзям бол...ш эфектыўна выкарысто...ваць вол...ны час, садзейнічае адвыканню ад такіх сацыял...на і біялагічна шкодных звычак, як ужыванне спіртных напіткаў і курэнне. Да фізічнай кул...туры і спорту далучаюцца праз навучанне ў спецыялізаваных установах (дзіцяча-юнацкіх спарты...ных школах, тэхнікумах, ВНУ), трэніро...кі ў спарты...ных секцыях па любым відзе спорту, удзел у занятках груп здаро...я па месцы вучобы, жыхарства або займаючыся самастойна.

Спорт вядомы з глыбокай старажытнасці, у тым ліку і ў Беларусі. Спарты...ныя элементы, блі...кія да сучасных відаў спорту (бег, скачкі, барац...ба і інш.), уваходзілі ў шматлікія народныя гул...ні. Першыя вядомыя спарты...ныя спаборні...твы адбыліся ў (С,с)таражытнай Грэцыі ў 1580 годзе да н.э. Хуткае развіццё спорту пачалося ў 2-й палове 19 ст., асабліва пасля стварэння ў 1894 годзе (М,м)іжнароднага алімпійскага камітэту і правядзення ў 1896 годзе першых (А,а)лімпійскіх гульняў. У Беларусі першыя спарты...ныя тавары...твы ўзніклі ў канцы 19 – пачатку 20 ст. Белару...кія спар...смены з 1952 года ўдзельнічаюць у (А,а)лімпійскіх гульнях. Імёны многіх белару...кіх спар...сменаў вядомы ў свеце. З 1991 года дзейнічае (Н,н)ацыянальны алімпійскі камітэт. Спорт у Беларусі з'я...ляецца агул...надзяржаўнай справай. Закон аб фізічнай культуры і спорце ад 18.06.1993 вызначае іх як неад...емную частку нацыянал...най кул...туры і гісторыі белару...кага народа («Чалавек і грамадства: Энцыклапедычны даведнік»).

***Практыкаванне 53***. *Запішыце прапанаваныя словы па-беларуску ў адпаведнасці з правіламі беларускага правапісу. Растлумачце значэнне тэрмінаў, назавіце іх спосаб утварэння.*

Авиашоу, йога, аэробика, юниор, биеннале, блицвояж, боулинг, велотриал, чемпион, олимпионик, джип-триал, легионер, флайер, стадион, мототриал, мундиаль, Параолимпиада, стайер.

***Практыкаванне 54***. *Запішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Вусна растлумачце выбар вялікай або малой літары.*

Амерыканскія вучоныя высветлілі, што да 2084 года глабальнае пацяпленне зробіць немагчымым правядзенне летніх (А,а)лімпійскіх (Г,г)ульняў у большасці гарадоў свету.

Аб гэтым паведамляецца ў часопісе The Lancet. Калектыў кліматолагаў з (У,у)ніверсітэта (К,к)аліфорніі ў (Б,б)эрклі выявіў, што праз 70 гадоў толькі восем гарадоў у (П,п)аўночным паўшар'і (за вылікам (Е,е)ўрапейскіх) змогуць прымаць (Г,г)ульні, у (П,п)аўночнай (А,а)мерыцы – усяго тры. У астатніх гарадах тэмпература стане невыносна гарачай для атлетаў і для публікі. У (Л,л)ацінскай (А,а)мерыцы і (А,а)фрыцы з канца XXI стагоддзя летнія (А,а)лімпійскія гульні праводзіць стане немагчыма. У (З,з)аходняй (Е,е)ўропе застанецца 25 гарадоў з невялікай рызыкай адмены тых ці іншых мерапрыемстваў. У астатнім свеце спіс прыдатных для (Г,г)ульняў гарадоў уключае ўсяго восем пазіцый: (С,с)анкт-(П,п)ецярбург, (К,к)раснаярск, (Р,р)ыга, (Б,б)ішкек, (У,у)лан-(Б,б)атар, (С,с)ан-(Ф,ф)ранцыска, (К,к)алгары і (В,в)анкувер («Звязда»).

***Практыкаванне 55***. *Прачытайце тэрміны-абрэвіятуры і іх тлумачэнні. Чаму, на вашу думку, у некаторых літарных і гукавых абрэвіятурах адбываецца несупадзенне расшыфроўкі значэння з іх літарным адлюстраваннем?*

*Перакладзіце прапанаваныя абрэвіятуры з іх поўнай расшыфроўкай на беларускую мову. Атрыманы пераклад змясціце ў слупках табліцы.*

| Абрэвіятуры, у якіх адбываецца *несупадзенне* расшыфроўкі значэння з іх літарным адлюстраваннем | Абрэвіятуры, у якіх адбываецца *супадзенне* расшыфроўкі значэння з іх літарным адлюстраваннем |
|---|---|
| | |

АИБА (Amateur International Boxing Association) – Международная ассоциация любительского бокса, АИО (Academie Internationale Olympique) – Международная олимпийская академия, АИПС (International Sports Press Association) – Международная ассоциация спортивной прессы, БОА – Белорусская олимпийская академия, ГАНОК – Генеральная ассамблея национальных олимпийских комитетов, АЕНОК – Ассоциация европейских национальных олимпийских комитетов, ВАДА (World Anti-Doping Agency) – Всемирное антидопинговое агентство, ИБФ (International Baseball Federation) – Международная федерация бейсбола, ИВФ (International Weightlifting Federation) –

Международная федерация тяжёлой атлетики, ИГФ (International Handball Federation) – Международная федерация гандбола, ИИХФ (International Ice Hockey Federation) – Международная федерация хоккея с шайбой, ИСУ (International Skating Union) – Международный союз конькобежцев, ЕОК – Европейский олимпийский комитет, МОК – Международный олимпийский комитет, НОК – Национальный олимпийский комитет, СИЕПС (Conseil International de l'Education Physique et Sportive) – Международный совет физического воспитания и спорта, СИЗМ (Conseil International du Sport Militaire) – Международный совет военного спорта, ТАС (Tribunal Arbitral du Sport) – Спортивный арбитражный суд, ИБУ (International Biathlon Union) – Международный союз биатлонистов, УСИ (Union Cycliste Internationale) – Международный союз велосипедистов, УОР – Училище олимпийского резерва, ИССП (International Society of Sport Psychology) – Международное сообщество спортивных психологов, ФИБА (Federation Internationale de Basketball Amateur) – Международная любительская федерация баскетбола, СДЮШОР – Специализированная детско-юношеская школа олимпийского резерва, ФИВБ (Federation Internationale de Volleyball) – Международная федерация волейбола, ФИЕ (Federation internationale d'Escrime) – Международная федерация фехтования, ФИЖ (Federation Internationale de Gymnastique) – Международная федерация гимнастики, ФИНА (Federation Internationale de Natation) – Международная любительская федерация плавания, ШВСМ – Школа высшего спортивного мастерства, ФИС (Federation Internationale de Ski) – Международная федерация лыжного спорта, ФИСА (Federation Internationale des Societes d'Aviron) – Международная федерация гребли, ФИСУ (Federation internationale du sport universitaire) – Международная федерация университетского спорта, ФИФА (Federation Internationale de Football Association) – Международная федерация футбольных ассоциаций, ДЮСШ – Детско-юношеская спортивная школа.

***Практыкаванне 56.*** *Паводле характарыстыкі, змешчанай ніжэй, назавіце імёны і прозвішчы славутых людзей. Запішыце іх, правапіс растлумачце. Падрыхтуйце вуснае выказванне пра аднаго з іх.*

1. Заснавальнік сучаснага алімпійскага руху. 2. Знакаміты нямецкі футбаліст і трэнер, чэмпіён свету 1974 года. 3. Іспанскі граф, які на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў узначальваў Міжнародны алімпійскі камітэт. 4. Нарвежскі біятланіст, трохразовы алімпійскі чэмпіён Солт-Лейк-Сіці. 5. Эфіопскі стаер, двухразовы алімпійскі чэмпіён у бегу на 10 000 м. 6. Легендарны амерыканскі баксёр, які ў часы «халоднай вайны» наведаў СССР. 7. Легендарны бразільскі футбаліст, трохразовы чэмпіён свету. 8. Канадскі хакеіст, які, гуляючы ў НХЛ, устанавіў некалькі яе рэкордаў: па колькасці закінутых шайб, па колькасці перамог у Кубку Стэнлі. 9. Шведская сяміборка, алімпійская чэмпіёнка Афін. 10. Амерыканскі плывец, 23-разовы алімпійскі чэмпіён.

*Праверце правільнасць выканання задання* (*ключ змешчаны ў Дадатку 2*).

***Практыкаванне 57****. Запішыце тэкст па-беларуску. Растлумачце правапіс вялікай літары, выкарыстоўваючы тэарэтычныя звесткі, прыведзеныя ў табліцах з правіламі.*

Ежегодно РЦФВС («Республиканский центр физического воспитания и спорта учащихся и студентов») проводит универсиаду среди учреждений высшего образования. В 2015 календарном году универсиада организована по 29 видам спорта, летнему и зимнему многоборью «Здоровье» Государственного физкультурно-оздоровительного комплекса Республики Беларусь. В 2014 году из общего количества участников республиканской универсиады 8 студентов имели звание «Заслуженный мастер спорта Республики Беларусь», 108 – «Мастер спорта международного класса Республики Беларусь», 831 – «Мастер спорта Республики Беларусь», более 1388 – «Кандидат в мастера спорта Республики Беларусь», более 6 тысяч – спортсмены массовых спортивных разрядов (в 2013 г. 5 студентов имели звание «Заслуженный мастер спорта Республики Беларусь», 107 – «Мастер спорта международного класса Республики Беларусь», 969 – «Мастер спорта Республики Беларусь»,

более 1350 – «Кандидат в мастера спорта Республики Беларусь», около 6 тысяч – спортсмены массовых спортивных разрядов). В историю проведения универсиад золотыми буквами вписаны выступления выдающихся спортсменов современной Беларуси. Только на протяжении последних лет в них приняли участие, придав этим состязаниям особый престиж, победитель XXVIII Олимпийских игр в Афинах Юлия Нестеренко (лёгкая атлетика), победители XXIX Олимпийских игр 2008 г. в Пекине Александр и Андрей Богдановичи (гребля на байдарках и каноэ), Артур Литвинчук (гребля на байдарках и каноэ), Андрей Арямнов (тяжёлая атлетика), серебряные призеры Андрей Рыбаков (тяжёлая атлетика), Андрей Кравченко (лёгкая атлетика), Наталья Михневич (лёгкая атлетика), бронзовые призёры Михаил Семёнов (борьба греко-римская), Андрей Михневич (лёгкая атлетика), Александра Герасименя, двукратный серебряный призёр XXX Олимпийских игр в Лондоне (плавание), Алексей Шемаров (борьба вольная) и многие другие (http://www.sporteducation.by).

***Практыкаванне 58.*** *Тэрміналагічны практыкум.*

✧ *Суаднясіце тэрміны* ***чэмпіён***, ***пераможца***, ***лідар*** *з прыведзенымі значэннямі:* 1) той, хто ідзе першым у якім-небудзь спаборніцтве; 2) той, хто дабіўся перамогі; 3) званне пераможцы ў спартыўных спаборніцтвах, гульнях на першынство, а таксама асоба або каманда, удастоеныя такога звання.

✧ *Вызначыце спосаб утварэння тэрмінаў.*

✧ *Растлумачце правапіс падкрэсленых літар.*

## ТЭМА 9. Назоўнік

***Практыкаванне 59.*** *Тэрміналагічны практыкум.*

✧ *Назавіце тэрміналагічнае значэнне слоў:*

*Сцягно – гэта...* 1) частка нагі, дзе злучаюцца бядровая і галёначная косці, 2) частка нагі ад таза да калена, 3) рухомае злучэнне касцей або храсткоў у арганізме чалавека.

*Лытка – гэта...* 1) частка нагі ад шчыкалаткі ўніз, 2) задняя частка ступні, 3) акругленыя мышцы на задняй частцы нагі (ад калена да ступні).

*Далонь – гэта...* 1) унутраны бок кісці рукі, 2) адна з канцавых рухомых частак кісці рукі або ступні ў чалавека, 3) частка кісці рукі паміж передплеччам і пясцю.

✧ *Вызначыце спосаб утварэння тэрмінаў* ***сцягно, лытка, далонь****: 1) лексіка-семантычны, 2) сінтаксічны, 3) уласналексічны* (*запазычанне*).

***Практыкаванне 60.*** *Вызначыце род назоўнікаў. Падбярыце да іх прыметнікі, з трыма словазлучэннямі складзіце сказы.*

Боль, дзюдо, дэрбі, каноэ, каратэ, кімано, медаль, пенальці, рэферы, табло, трыко, турнэ, Корбут, Мехіка, Солт-Лейк-Сіці, Медэа, МАК, НБА, НХЛ, Рудзіша, Лохтэ, Плаціні.

***Практыкаванне 61.*** *Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Падкрэсліце назоўнікі, род ці лік якіх адрозніваецца ў рускай і беларускай мовах.*

Спортивный зал, средний вес, поднятие тяжестей, лимит времени, отрыв от ковра, вывести из равновесия, технический контроль оружия, бросок от груди, церемония награждения, касание рукой, олимпийское движение, преимущество в скорости, расписание тренировок, численный перевес, обидное поражение, остановка игры, расстояние до мишени, зажечь белый свет.

***Практыкаванне 62.*** *Запішыце прапанаваныя назоўнікі ў форме:*

*1) давальнага і меснага склону:*

Апора, атака, барацьба, глыбіня, даўжыня, дыстанцыя, нага, перадача, сіла, тэхніка.

*2) роднага і меснага склону:*

Аўт, барэц, бар’ер, брас, біятланіст, гоншчык, захоп, перыяд, руль, рух, сектар, спорт, спрынтар, суддзя, тайм.

*3) творнага склону:*

Актыўнасць, бадзёрасць, боязь, гнуткасць, далонь, спрытнасць, кішэнь, магчымасць, мішэнь, цыклічнасць.

***Практыкаванне 63.*** *Спішыце* (*згодна абранаму віду спорту*) *адзін з прапанаваных у Дадатку 1 тэкст, пастаўце назоўнікі ў патрэбную склонавую форму. Падкрэсліце тэрміны-назоўнікі. Растлумачце іх значэнне і вызначыце спосаб утварэння.*

***Практыкаванне 64.*** *Запішыце сказы, пастаўце назоўнікі ў патрэбны склон.*

1) Мы ганарымся нашымі спартсменамі: (Віталь Шчэрба, Аляксандр Мядзведзь, Кацярына Хадатовіч, Юлія Несцярэнка, Эдуард Малафееў, Аляксандр і Андрэй Багдановічы, Андрэй Краўчанка, Дар’я Домрачава). 2) Цяжка ўявіць гісторыю беларускага футбола без (Аляксандр Пракапенка, Сяргей Алейнікаў, Сяргей Бароўскі, Валянцін Бялькевіч, Эдуард Зарэмба, Аляксандр Кульчый). 3) Сусветныя рэкорды па лёгкай атлетыцы належаць (Усэйн Болт, Кененіса Бекеле, Сяргей Бубка, Юрый Сядых, Эштан Ітан, Стэфка Кастадзінава, Інэса Кравец). 4) Сярод лепшых плыўцоў свету трэба ўзгадаць імёны (Майкл Фэлпс, Марк Спітц, Ян Торп, Джоні Вайсмюлер, Уладзімір Сальнікаў, Аляксандр Папоў). 5) Значны ўклад у развіццё беларускага гандбола зроблены (Сяргей Авакумаў, Спартак Міранович, Аляксандр Каршакевіч, Юрый Шаўцоў, Канстанцін Шараваraў, Сяргей Рутэнка).

**ЗАДАННІ ПА ТЭМЕ “ПРЫМЕТНІК”**

1.Спішыце сказы. Падкрэсліце прыметнікі, вызначце іх разрад. Ад якасных прыметнікаў утварыце ўсе магчымыя формы ступеняў параўнання. Назавіце якасныя прыметнікі, ад якіх ступені параўнання не ўтвараюцца.

1. Люблю твае, Нарач, затокі і тоні, як вецер густыя туманы развесіць (М.Танк). 2. Гадзіна, нібы бэзавае ранне, прайшла (хоць гэтак блізка), а наўзбоч (Я.Янішчыц). 3. Мінск стольны, Мінск светлы, Мінск бела-зялёны, няма тут завулкаў пакрыўленых, вузкіх (П.Панчанка). 4. Неба чыстае і глыбокае і бярозавы ціхі гай – Беларусь мая сінявокая, Беларусь мая, родны край (У.Карызна). 5. Я чула пяшчотнае, шчырасці поўнае, маё, беларускае, роднае, кроўнае, такое раптоўнае, такое чароўнае, такое ласкавае, цёплае, чыстае, як сонца, агністае, як Нёман, празрыстае, як казка, быліна, як песня, жаданае, дагэтуль зусім у жыцці не спазнанае, вясновае слова ад шчырага сэрца (Д.Бічэль). 6. Адгрукаў гром. Адгаманіла лета на мове зор малінавых і кветак (П.Панчанка). 7. Жыве між нас ад продкаў русых, самааддана служыць дню густая мова беларусаў, багатая на дабрыню (Г.Пашкоў). 8. Асцярожна трымаў на далонях тугіх серабрыстае зарыва клён (П.Панчанка). 9. Я жыў ля Любенскага возера, я быў шчаслівы, малады. І за лістком барвовай восені плылі, як ветразі, гады… (М.Башлакоў). 10. Май. Вішнёвы пажар. Сіні ранак (П.Панчанка). 11. На скразняку, у пераходзе – вішнёвая віяланчэль. (Н.Гальпяровіч). 12. Раніцай на траве ляжаў рэдкі іней, зляталіся да ляснога дамка сарокі і сойкі, а бэзавы куст ля ганка стаяў ненатуральна голы, закіданы ўнізе цёмна-зялёным бліскучастым лісцем (М.Стральцоў). 13. Прыедзь у край мой ціхі, тут продкаў галасы, тут белыя буслíхі і мудрыя лясы (Я.Янішчыц). 14. Пах смалісты п’ю і не нап’юся, і пад гром птушыных галасоў да бярозы белай прыхінуся, – буду прагна піць салодкі сок (П.Панчанка). 15. Ні спачуванняў тых, ні перашкоды, ні адчування смутку, ні віны. Адно – бруяцца бэзавыя воды і, як стагоддзі роднае прыроды, – стаяць на вечнай варце валуны… (Я.Янішчыц). 16. Стагналі дрэвы мнагарукія, ламаўся з грукатам прастор (П.Панчанка). 17. Адчайна-малады, ты п’еш па-веснавому палескія сады, вішнёвых дзён аскому (Я.Янішчыц). 18. Прыеду я у той куток зялёны, аддам паклон сунічнай старане, дзе на сядзібах маладыя клёны шумяць аб нечым дарагім і мне (Р.Баравікова). 19. Я жыў ля Любенскага возера, я быў шчаслівы, малады. І за лістком барвовай восені плылі, як ветразі, гады… (М.Башлакоў).

2.Спішыце сказы, падкрэсліце складаныя прыметнікі, вызначце спосабы іх утварэння.

1. Паміж пустак, балот беларускай зямлі, на ўзбярэжжы ракі шумнацечнай, дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, – ўдзірванелы курган векавечны (Я.Купала). 2.Па-над белым пухам вішняў, быццам сіні аганёк, б’ецца, ўецца шпаркі, лёгкі сінякрылы матылёк (М.Багдановіч). 3. Злятае на дасвецці галубіным то рыжы ліст, то жоўта-залаты (Я.Янішчыц). 4. Не згасні, мой вогнік далёкі-далёкі, у сіняй смузе сакавіцкай начы (Л.Рублеўская). 5. Па травах светла-шызых мы пройдзем ля ракі… (Я.Янішчыц). 6. Асенні гай прасветлена-празрысты. І толькі шэпт лістоты залатой. І дзень надзіва сонечны і чысты над ціхаю прасторай палявой… (М.Башлакоў). 7. Пакуль яшчэ лугі, палі тут не пакошаны, спяшаюся сюды, нібыта ў рай, у мой бярозава-рамонкава-валошкавы, у непаўторны, любы, родны край (М.Пазнякоў). 8. Белапушыстыя ўскінуты бровы (Я.Янішчыц). 9. Глуш начы разлеглася шматвёрстая, не чуваць гамонкі анідзе (П.Панчанка). 10. Залатымі манетамі зорак зноўку свеціцца неба над намі. Неба ў нас – беларускае мора з белакрылымі ў ім караблямі (В.Шніп). 11. Нарач, лёгкі ветрык, подых вечаровы. Край гаюча-светлы, ты вярнуў мне мову (А.Быкаў). 12. Горкі беласнежныя падушак – як з-пад галубінага крыла… (Я.Янішчыц). 13. Меднастволы сасоннік, белакоры бярэзнік, я ваш вечны палоннік і нявечны равеснік (А.Пісьмянкоў). 14. Край нездарма сінявокім завецца – сіне і светла душы (Я.Янішчыц). 15. Я толькі заездам сюды, падарожнік, каб горы твае асвятліць на хвіліну агнём маёй зоркі пякуча-трывожным, а потым вярнуцца да роднай краіны (П.Панчанка). 16.Сэрцу збалеламу ёсць на прыкмеце белабярозавы кут (Я.Янішчыц). 17. Вось і снежань. Вятры табуны белагрывыя гоняць па бяскрайніх прасторах сцюдзёных палёў і аселіц… (П.Панчанка). 18. Многагалосаю песняю захлынаецца бор (Я.Янішчыц). 19. Дзяцей шматвопытныя позіркі заваражыў пагодны дзень (П.Панчанка). 20. Я зноў на станцыі лясной, марозна-звонкай, заінелай, стаю ў Бялынкавічах белых, прапахлых смольнаю сасной (А.Пісьмянкоў). 21. Зязюля, мне яшчэ ў маленстве ты накукавала сотню зім і вёсен. І шматгалосым рэхам бор густы памножыў лік на безліч звонкіх сосен (П.Макаль). 22. Стагналі дрэвы мнагарукія, ламаўся з грукатам прастор (П.Панчанка). 23. Большасць з іх [сняжынак], крануўшыся доўгачаканай зямлі, адразу зліваліся з ёй, растаўшы ў цёпла-марозным паветры і развітаўшыся з надзеямі знайсці хоць калі-небудзь сваё непаўторна-прывіднае шчасце – шчасце вечнага жыцця… (Д.Пятровіч). 24. І я малюся на бялюткі ліст, нібы на луг мядова-траваросны. Яшчэ на ім пад салаўіны свіст радкі ўзрастуць і забуяюць вёсны (М.Шабовіч).

3. Прачытайце сказы. Выпішые сказы з субстантываванымі прыметнікамі.

1.Голас незнаёмага можа здзівіць, голас друга – на хвіліну спыніць, голас любай – сагрэць сонцам лета, голас маці – вярнуць з таго свету (М.Танк). 2. Я ведаю: ёсць час скупы і горкі, ёсць міг, калі у подзвігу сваім жывыя ўсё ж звяртаюцца да мёртвых і мёртвыя адказваюць жывым! (Я.Янішчыц). 3. Спазніцца можна на адну гадзіну, спяшайцеся! А то на горкі здзек адзіную, харошую, адзіную сустрэне выпадковы чалавек (М.Дукса). 4. З нас многія прагнуць разумнага, сапраўднага і чалавечнага. А восень, цяжкая і сумная, шпурляе ліствой пакамечанай (П.Панчанка). 5. Спакойныя мяне перажывуць, як многіх на вяку перажывалі (Л.Галубовіч). 6. Калі вы маўчыцё, то ўсё таму, што самае галоўнае сказалі! (Я.Янішчыц). 7. Павеяла цяжкім, і сумным, і пражытым (П.Панчанка). 8. Ярлык прыклеяць самыя святыя і грэшныя – упасці не дадуць (Я.Янішчыц). 9. А я маладых не лаю за доўгія валасы, а я маладым не раю галіцца дзеля красы (П.Панчанка). 10. Не бэшчу ні міні, ні максі, а джынсы і сам надзеў. Былі б толькі твары, не маскі у маладых людзей (П.Панчанка). 11. Я жыў ля Любенскага возера, я быў шчаслівы, малады. І за лістком барвовай восені плылі, як ветразі, гады… (М.Башлакоў). 12. Не вер, што хмарыцца зямля парою сумна-вечаровай. Благое пройдзе спакваля, а добрае – не за гарою (М.Шабовіч). 13. Да ўсяго, што ў нас смелага, да праўды людской, як да яблыка спелага прытуліся шчакой (П.Панчанка). 14. Прыеду я у той куток зялёны, аддам паклон сунічнай старане, дзе на сядзібах маладыя клёны шумяць аб нечым дарагім і мне (Р.Баравікова).

4.Утварыце ўсе магчымыя формы ступеняў параўнання ад наступных якасных прыметнікаў:

Вясёлы, шчаслівы, малады, старанны, адказны, шчыры, светла-зялёны, буланы, лясісты, зялёны, бэзавы, вішнёвы, чарнавокі, прыгожы.

5.Спішыце сказы, вызначце форму прыметнікаў (поўная, сцягнутая, кароткая), іх сінтаксічную ролю.

1.Асеннімі дажджамі заліло апошнія чаканні і спатканні, пажоўклых клёнаў ціхае святло, скупога сонца роснае дыханне (П.Панчанка). 2. І ў белы дзень, і ў чорну ноч я ўсцяж раблю агледзіны, ці гэты скарб не збрыў дзе проч, ці трутнем ён не з’едзены (Я Купала). 3. Як ты дорага мне, мая родная мова!

Мілагучнае, звонкае, спеўнае слова! (Н.Гілевіч). 4. Не вер, што свет шырок, ён думкам цесны (А.Куляшоў). 5. Радзіма, малая радзіма – а вёсачка ўсцяж нелюдзіма… (М.Пазнякоў). 6. О, белыя яблыні, белыя яблыні, пялёсткаў шалёны хвалюючы пах! Дзяўчаты пужлівыя, хлопцы нязграбныя, і хмель веснавы на гарачых губах! (П.Панчанка). 7. Падаюць сняжынкі – дыяменты-росы, падаюць бялюткі за маім акном… Расчасалі вішні шоўкавыя косы і ўранілі долу снегавы вянок (П.Трус). 8. Я маці абавязан кожнай рыскаю, драўлянай лыжкаю, глінянай міскаю – усім, чым працы абавязан стол. (А. Куляшоў). 9. Малюнкі родныя і з'явы! Як вы мне любы, як цікавы! (Я.Колас). 10. Хутчэй бы прыйшла вясна з сонечнымі вадаспадамі, з блакітнымі навальніцамі, з шалёным пахам чаромхі і салаўіным каханнем, – людзі штогод жадаюць (П.Панчанка). 11. Я жыў ля Любенскага возера, я быў шчаслівы, малады. І за лістком барвовай восені плылі, як ветразі, гады… (М.Башлакоў). 12. Асеннімі дажджамі заліло апошнія чаканні і спатканні, пажоўклых клёнаў ціхае святло, скупога сонца роснае дыханне (П.Панчанка). 13. Лістотаю залатою верасень выслаў ганак. Антонаўкай, сырадоем, бульбаю маладою пахне крамяны ранак (А.Пісьмянкоў). 14. Я сёння настолькі багата, што ўжо не баюся збяднець! (Я.Янішчыц). 15. Самі сябе падправім, каб кожны быў свецел і дуж (П.Панчанка). 16. Ці лячу сюды параіцца, ці душу сваю пачуць, – белы гусі, белы чаіцы гаману са мной вядуць (Я.Янішчыц).

6.Замяніце ў словазлучэннях назоўнікі роднага склону прыметнікамі. Вызначце суфіксы прыметнікаў.

Хата бацькі, веласіпед Васі, сукенка сястры, касцюм брата, радасць Алеся, знаходка Алесі, гняздо ластаўкі, кніга Пеці, арэшкі вавёркі, пацеркі Насці, сшытак Віці.

7.Спішыце сказы, падкрэсліце прыналежныя прыметнікі, абазначце суфіксы, з дапамогай якіх яны ўтвораны.

1.Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына; паміж сваіх і чужакоў яна мне ласкай матчынай (Я.Купала). 2. Краіна мая, радась мая, песня мая маладая! Па нівах тваіх, па тваіх гаях сынава сэрца рыдае (П.Панчанка). 3. Зямля, як матчына далонь, калолася і пахла хлебам, і васілёк над галавой бязвоблачным гайдаўся небам (Г.Пашкоў). 4. Усё вастрэй – радні маёй прагалы, агеньчык дрогкі з маміных акон (Я.Янішчыц). 5. Пачынаць паэтычны спеў яму [Якубу Коласу] дапамагалі хвалі Нёмана, гоман лесу, лугавое раздолле, дзядзькавы казкі, матчыны песні і само жыццё, якое настойліва

стукалася ў акенца ціхай і глухой леснічоўкі (С.Александровіч). 6. “Матчына мова за руку павяла, – прызнаваўся пазней Якуб Колас і, хвіліну памаўчаўшы, дадаваў: – Беларускае слова, пяшчотнае і ласкавае, гнеўнае і сумнае, паслухмянае і гнуткае ў паэтычным радку, было бліжэйшае і мілейшае майму сэрцу” (С.Александровіч). 7. Як самую звонкую ў свеце навуку, як ройных вякоў пчаліную складчыну, прымаю па складу, па смаку, па гуку мову маю матчыну! (П.Макаль). 8. Злятае на дасвецці галубіным то рыжы ліст, то жоўта-залаты (Я.Янішчыц). 9. Гнёзды шпачыныя над Палатой. Цені дубоў над халоднай вадой. (Н.Гальпяровіч). 10. Кожнаму з нас лёс адводзіць свой зямны куток, дае бясцэнны дар жыцця і непаўторную матчыну ласку, родную мову і святое адчуванне ўласнай годнасці (Г.Бураўкін). 11. Тут мой нясмелы крок і першае прызнанне, тут лёгка мне заўжды пад маміным крылом. Спяшаюся сюды на шчырае спатканне і ў ранні лістабой, і ў позні крыгалом (М.Шабовіч). 12. І не было нічога ярчэй за сонца на родным небе, і не было нічога смачней матчынага хлеба (П.Панчанка). 13. Як самую звонкую ў свеце навуку, як ройных вякоў пчаліную складчыну, прымаю па складу, па смаку, па гуку мову маю матчыну! (П.Макаль). 14. Паўтараецца вечна, а гучыць не завучана кожнай новай вясной кукаванне зязюльчына (П.Панчанка).

8. Спішыце сказы. Падкрэсліце прыметнікі з вышэйшай і найвышэйшай ступенямі параўнання. Раскажыце пра асаблівасці іх ужывання.

1.Да смагі, да хрусту, да болю, да самай апошняй з мінут іду і бягу за табою, зрываючы путы пакут (Я.Янішчыц). 2. Слова! Цуд найвялікшы між цудаў-дзівосаў, што здзіўляў у вяках і здзіўляе нанова. Трапяткое, жывое, як сонца ў росах, несмяротнае, роднае матчына слова! (Н.Гілевіч). 3. Расхінаю полаг смалянога бору на зазыўны голас злога камара. Скрозь каля Глыбокага – глыбіня азёрная. За яе глыбейшай, пэўна што, няма (Г.Пашкоў). 4. Самы салодкі сон, самы святочны настрой, самы святлісты ўспамін, самы празрысты сум – дома, у мамы (М.Пазнякоў). 5. Надзеі і трывогі да найвышэйшых зор на музыку дарогі паклаў начны прастор (Я.Янішчыц). 6. Над маёй Лагойшчынай лясістай – спеў салоўкі самы галасісты (С.Давідовіч). 7. Грай матыў свой, адвечны мастак! Можа, у гэтым бязмоўным Сусвеце ты – мой самы апошні сваяк на пакрыўджанай намі планеце? (З.Марозаў). 8. За жнівом надыходзяць дажынкі, той шчаслівы, хто ўпору дажне, шчаслівейшы, – хто з першай дажджынкай толькі-толькі сяўбу распачне (Р.Баравікова). 9. Ярлык прыклеяць самыя святыя і грэшныя – упасці не дадуць (Я.Янішчыц). 10. Як самую звонкую ў свеце навуку, як ройных вякоў пчаліную складчыну, прымаю па складу, па смаку, па гуку мову маю матчыну! (П.Макаль). 11. Памяць народа – гэта самае вялікае багацце, якое і называецца спадчынай (В.Вітка).

12. Найлепшая ў свеце краіна у сэрцы з табою жыве… (В.Шніп). 13. Менш удачлівыя з іх [сняжынак] лёталі перад фарамі машын, спадзеючыся хоць бы ў апошні момант зліцца з псеўдасонечнымі промнямі, растапіўшы свае халодныя сэрцы (Д.Пятровіч). 14. Я да цябе прапісаны, мой край, матулі наймілейшымі вачыма… (М.Шабовіч). 15. З табою была мне праца лягчэйшай і весялейшай… (П.Панчанка). 16. Мабыць, самы прыгожы з усіх беларускіх шляхоў – лясны шлях з Мінска да Полацка (В.Быкаў). 17. Найлепшая з усіх маіх прыгод вясёлай адплаціла сёння карай (П.Панчанка). 18. Для мяне з лугоў надрэчных травы лепшы ў свеце вынеслі букет (Я.Янішчыц). 19. Раніцай знайду між траў і лісцяў самых лепшых вершаў цёплы след (П.Панчанка). 20. Як просіцца сцежка пад ногі і тчэцца яе палатно! Да самай апошняй дарогі я буду з табой заадно… (Я.Янішчыц). 21. А я адпачываць нікуды не паеду: найлепшы адпачын – на роднае зямлі… (М. Шабовіч).

9.Запішыце сказы, падкрэсліце прыметнікі з суфіксамі ацэнкі і меры якасці. Раскажыце пра асаблівасці іх утварэння.

1.На вачах у замроенага адвячорка маладзюткі туман сівее... (Р. Барадулін). 2. Няма патрэбы ў дзень вясенні свой танклявым гуртам змізарнела-дробным стаяць пад шапкай высачэзных хвой і выпадковым радавацца промням (М.Дукса). 3. У лёгенькім, як вецер, паліто, нясмелая, нагадваю лілею (Я.Янішчыц). 4. Росная, зялёная Айчына! На цябе, паўнюткую святла, пазіраюць круглымі вачыма птушаняты з цёплага дупла (П.Панчанка). 5. Белаваты водсвет ляжаў на стале (У. Караткевіч). 6. Ні зімы табе ладнай, ні ружовенькіх шчок. “А на нашы Каляды ты прыедзеш, сынок?” (А.Быкаў). 7. На ялінках росных зор мільярды, дурнап'яну гаркаваты пах (П. Панчанка). 8. Ў цёмным небе – хараводы сiняватых зорак… (М. Багдановіч). 9. Стрункія сосны на беразе стромкім. Хлопчык бялявы тут марыць пра стронгу (А.Пісьмянкоў). 10. Якой даўжэзнай мне здаецца ноч, што не з табой – з бяссонніцай на пару… (М.Шабовіч). 11. Веі замружу, і ўбачыцца вечар – белая цэркаўка тоненькай свечкай. Гнёзды шпачыныя над Палатой. Цені дубоў над халоднай вадой. (Н.Гальпяровіч). 12. І я малюся на бялюткі ліст, нібы на луг мядова-траваросны. Яшчэ на ім пад салаўіны свіст радкі ўзрастуць і забуяюць вёсны (М.Шабовіч).

## ТЭМА 11. Лічэбнік

***Практыкаванне 73.*** *З прапанаваных лічэбнікаў і назоўнікаў утварыце колькасна-іменныя спалучэнні, з трыма з іх складзіце сказы.*

2 (спартсмен), 2 (гімнастка), 22 (футбаліст), 6 (хакеіст), 2,45 (метр), 42,195 (кіламетр), 9,58 (секунда), 359 (кілаграм), 11 (метр), 156 (грам).

***Практыкаванне 74.*** *Прачытайце сказ. Выпішыце з яго спалучэнні лічэбнікаў з назоўнікамі, праскланяйце іх.*

Сёння ў краіне функцыянуюць больш як 23000 аб’ектаў фізкультурна-спартыўнага прызначэння, у тым ліку 144 стадыёны, 332 басейны, 4588 спартыўных залаў, 52 спартыўныя манежы, 35 збудаванняў са штучным ільдом.

***Практыкаванне 75.*** *Спішыце тэкст. Лічэбнікі запішыце словамі, назоўнікі пастаўце ў неабходную склонавую форму.*

У праграму Алімпійскіх гульняў могуць быць уключаны віды спорту, якія шырока распаўсюджаны не менш як у 40 (краіна) 3 (кантынент) сярод мужчын і ў 25 (краін) 2 (кантынент) сярод жанчын.

Беларусь можа ганарыцца сваёй гісторыяй удзелу ў Алімпійскіх гульнях: 76 (беларус) сталі алімпійскімі чэмпіёнамі.

Як незалежная дзяржава Беларусь удзельнічала ў зімовых Алімпійскіх гульнях у Лілехамеры ў 1994 (год) і заваявала 2 (срэбны медаль).

На зімовай Алімпіядзе 2014 (год) у Сочы каманда Беларусі заваявала 6 (медаль), у тым ліку 5 (залаты) і 1 (бронзавы), забяспечыўшы Беларусі рэкорднае ў суверэннай гісторыі 8 (месца) у медальным заліку.

На XXXI (летняя Алімпіяда) у Рыэ-дэ-Жанэйра каманда Беларусі была прадстаўлена ў 75 (дысцыпліна) праграмы і ў выніковым медальным заліку заняла 40 (месца). На рахунку беларускіх алімпійцаў 9 (узнагарод) Рыа.

*Раскажыце пра рэкорды або найлепшыя дасягненні у вашым відзе спорту.*

## ТЭМА 12. Дзеяслоў

***Практыкаванне 77.*** *Тэрміналагічны практыкум.*

✧ *Назавіце тэрміналагічнае значэнне слоў:*

*Парыраваць – гэта...* 1) перадаваць адзін другому мяч, шайбу і пад., 2) адбіць удар, 3) адкінуць сустрэчным ударам.

*Блакіраваць – гэта...* 1) страляючы, трапіць пэўную колькасць разоў у мішэнь; 2) перапыніць шлях мячу саперніка; 3) кінуць уверх.

*Акліматызавацца – гэта...* 1) прыстасавацца да іншага клімату; 2) набыць навыкі, уменне жыць, працаваць, абыхозіцца ў пэўных абставінах, 3) прыстасавацца да зменлівых умоў.

✧ *Вызначыце спосаб утварэння тэрмінаў.*

✧ *Праспрагайце дзеясловы.*

***Практыкаванне 78.*** *Запішыце загадкі, дапісваючы канчаткі дзеясловаў. Вызначыце спражэнне дзеяслова.Адгадайце загадкі. Назавіце віды спорту, у якіх выкарыстоўваюцца прадметы-адгадкі.*

1) Пашл... пасланца па мілага госця, ці будз... госць, ці не будз..., а пасланец не верн...цца. 2) Малыш-каратыш чыха... жарам, абда... варам, агнём палю..., комам ду... . 3) Бяг... сычыкі, задраўшы лычыкі. 4) Ед... не дарогаю, паганя... не пугаю, азіра...ся назад: следу няма. 5) Б’... яго нагамі, б’... яго рукамі, ён не скардз…ца, не плач..., моўчкі лёта... і скач... . 6) Болей б’... – ён лепей скач..., не сярду... і не плач... . Моцна ўдар... – не дагон..., а ў вадзе з ім не патон... . 7) Адразу ў дзве сцежкі ед… – не на колах, ід… – не пешкі. 8) Па сцяжыне, па дарозе бегчы я ў іх не ў змозе. І па снезе не ід…, лёд убач… – і лят…! 9) Б’… яго спартсмен ракеткай, ён не крыўдз…ца за гэта і ніколі ён не плач…: ні калі ляж… ці скач… . 10) Асядла… я яго – пабяж…, а як злез… з сядла – дык ляж….

***Словы для даведак***: пісталет; мяч; тэнісны мячык; лыжы; санкі; веласіпед; стралок, стрэльба, выстрал; лодка; канькі.

***Практыкаванне 79.***

*І. Пастаўце дзеясловы ў неазначальную форму, абазначце суфіксы.*

Атакую, выкідваю, папярэджваю, стартую, рыхтую, актывізую, пераскокваю, інструктую, падтрымліваю, не залічваю, кірую, пераадольваю, спрабую, крытыкую, трэніраю.

*ІІ. Дзеясловы закончанага трывання замяніце дзеясловамі незакончанага трывання, растлумачце правапіс суфіксаў дзеясловаў.*

Застацца, паспець, затрымаць, перадаць, настроіцца, выйграць, супакоіць, выканаць, угаварыць, папярэдзіць, узначаліць, падвоіць, узнагародзіць, абскардзіць, залічыць.

*ІІІ. Перакладзіце дзеясловы з рускай мовы на беларускую, абазначце суфіксы.*

Контролировать, фиксировать, финишировать, квалифицировать, акклиматизироваться, дисквалифицировать, травмировать, имитировать, дублировать, апробировать, симулировать, активизировать, группироваться, лидировать, синхронизировать.

*Выберыце 10 дзеясловаў і складзіце з імі тэкст.*

***Практыкаванне80.*** *Утварыце ад прапанаваных дзеясловаў дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі.*

Закінуць мяч, завяршыць атаку, затрымліваць саперніка, запаволіць тэмп, залічыць гол, крануцца лініі, лідзіраваць у спаборніцтвах, узнагародзіць пераможцу, аспрэчваць рашэнні суддзі, паказаць жоўтую картку.

*Ад якіх дзеясловаў вы не ўтварылі дзеепрыметнікі?*

***Практыкаванне 81.*** *Перакладзіце сказы на беларускую мову, выкарыстоўваючы прапанаваныя способы замены неўласцівых беларускай мове форм дзеепрыметнікаў:*

| | |
|---|---|
| Дзеяслоў | Десятиборье, классическое легкоатлетическое многоборье для мужчин, ***включающее*** десять видов лёгкой атлетики. |
| Дадаены сказ | Спортсмен, не ***выступивший*** в одном из видов десятиборья, не допускается к последующим соревнованиям, и его имя не будет фигурировать в окончательной классификации. |
| Назоўнік | Прыжки в высоту выполняются с произвольного разбега. ***Занимающийся***, заняв исходное положение, начинает бег с ускорением и доводит скорость до оптимальной, обеспечивающей наилучшее условие для отталкивания. |
| Прыметнік | На ***следующих*** Олимпийских играх (Стокгольм, 1912) спорсмены разыгрывали медали уже в двух эстафетах – 4 х 100 м и 4 х 400 м. |
| Дзеепрыслоўе | Каролина Клюфт, ***завоевавшая*** титул лучшей легкоатлетки Европы в 2003 году, ныне провела что-то вроде сезона мечты. |
| Ужывальная форма дзеепрыметніка | Глядя на символ Олимпийских игр, вспоминаем, что пять тесно ***сплетающихся*** колец говорят о спортивном содружестве, о равенстве людей пяти частей света. |

***Практыкаванне 82.*** *Даволі часта ў спартыўных рэпартажах можна пачуць наступныя словазлучэнні:* ***летающий лыжник****,* ***стреляющий лыжник****,* ***играющий тренер****,* ***атакующий защитник****,* ***блокирующий игрок****,* ***замыкающий турнирную таблицу****,* ***подающий игрок****.*

*Каго так называюць? Як можна перакласці гэтыя выразы? Які пераклад будзе больш правільны? Што зменіцца, калі дзеепрыметнікі замяніць дадаым сказам?*

## ТЭМА 13. Прыслоўе

***Практыкаванне 83.*** *Запішыце тэксты. Выпішыце прыслоўі. Вызначце, якім спосабам яны ўтвораны.*

*Дыхальная гімнастыка*

1. Зыходнае становішча – лежачы на спіне, адна рука на грудзях, другая на жываце, расслабіцца. Удыхнуць праз нос, «надуць» жывот, паволі і працягла выдыхаць, «уцягнуць» жывот. Паўтарыць 15–20 разоў.

2. Зыходнае становішча – седзячы на крэсле, рукі на каленях: расслабіцца. Звычайны ўдых, затрымка дыхання. Павольны выдых. Паўтарыць 50 разоў.

*Гімнастыка для паставы*

1. Зыходнае становішча – асноўная стойка. Падняць левую руку ўперад і ўверх, а правую адвесці назад, узняцца на наскі – удыхнуць. Вярнуцца ў зыходнае становішча – выдыхнуць. Рукі чаргаваць.

2. Зыходнае становішча – стойка «ногі на шырыні плеч». Нахіліцца ўправа, адводзячы руку за спіну, а левую, падымаючы ўверх, – выдыхнуць. Выпраміцца ў зыходнае становішча – удыхнуць. Зрабіць тое самае ў іншы бок.

*Запішыце па 2–3 практыкаванні на развіццё мышцаў ног і прэсу.*

***Практыкаванне 84.*** *Запішыце прапанаваныя прыслоўі ў тры слупкі: 1) прыслоўі пішуцца разам, 2) прыслоўі пішуцца праз злучок, 3) словы пішуцца асобна.*

(Па)малу, (па)мойму, (па)першае, (па)геройску, (па)абапал, (па)блізу, (па)новаму, (па)волі, (па)вучальна, (па)беларуску, (з)верху, (з)нізу, (у)адкрытую, (з)разбегу, (у)рассыпную, (да)дому, (с)пачатку, (на)сустрач, (на)хаду, (з)верху (да)нізу.

## ТЭМА 14.Займеннік, прыназоўнік, часціца

***Практыкаванне 85.*** *Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Падкрэсліце прыназоўнікі.*

Отказ от борьбы, победа ввиду неявки противника, поражение по очкам, выход из ворот, вести в счете, прыжок в упор, прыжок через коня, прыжок с шестом, сектор для толкания ядра, бороться за победу, соревнования вне стадиона, атака с первой передачи, вбрасывание мяча из-за боковой линии, гол из положения вне игры, поворот вокруг своей оси.

***Практыкаванне 86.*** *Прачытайце тэкст, вызначыце яго стыль.*

*Устаўце патрэбную часціцу (**не** ці **ні**). Растлумачце, разам ці асобна трэба пісаць гэтыя часціцы.*

Трэба адзначыць, што (н...)водная з сучасных дэфініцый спорту (н...)дае ў пэўнай меры адказ на пытанне «што такое спорт» у сучасным яго вымярэнні.

У сучасным спорце найбольш дакладна вылучаюцца дзве яго характарыстыкі – дзейнасць (фізічная, псіхічная, інтэлектуальная, маральная і г. д.) і спаборніцтвы. (Н...)льга (н...)пагадзіцца з тым, што толькі поспехі ў развіцці чалавечай цывілізацыі дазволілі стварыць такую моцную сацыяльную з'яву, як спорт. Важна таксама адзначыць, што асноўныя кампаненты структуры спорту – прафесійны спорт, аматарскі спорт, спорт для ўсіх і камерцыйны спорт – найлепш падкрэсліваюць у працэсе сваёй рэалізацыі «дзейнасць» і «спаборніцтвы». Калі прафесійны і аматарскі спорт характарызуюцца пераважна спаборніцтвамі, то спорт для ўсіх і камерцыйны спорт хутчэй за ўсё вызначаюцца наяўнасцю дзейнасці.

Зразумела, што спорт (н...)колі б (н...)набыў тое значнае ролі ў грамадстве, якую ён мае зараз і якая ўсё павышаецца, калі б (н...)меў сваёй дзівоснай здольнасці татальнага распаўсюджвання і ўзаемадзеяння з іншымі сацыяльнымі феноменамі. У яго арбіту ўключаюцца велізарныя масы людзей, у яго функцыянаванне ўкладваюцца гіганцкія сумы грошай (паводле У. Люкевіча).

*Знайдзіце тэрміны-словазлучэнні, растлумачце іх значэнне і ўтварэнне.*

***Практыкаванне 87.*** *Спішыце выслоўі. Выберыць у дужках неабходную часціцу, запішыце разам ці асобна.*

1) (Ні, не)гром, (ні, не)маланка (ні, не)бярэ. 2) Хвароба (ні, не)кога (ні, не)красіць. 3) Хвароба (ні, не)пернік, (ні, не)пракаўтнеш і (ні, не)адкажашся. 4) Чалавек галодны да (ні, не)чога (ні, не)згодны. 5) (Ні, не)спыніцца ў гонцы, (ні, не)зблізку (ні, не)разгледзець – хто спрынтары і хто тут марафонцы… (У. Някляеў). 6) (Ні, не)валодаючы целам, (ні, не)авалодаеш душой (А. Звонак). 7) (Ні, не)верце гладзенькай дарозе, бо, часам, (ні, не)туды вядзе (А. Грачанікаў). 8) (Ні, не)дар, (ні, не)спрыт, (ні, не)навык (ні, не)дапаможа, калі спіць душа (Н. Гілевіч).

***Практыкаванне 88.*** *Спішыце словазлучэнні, выбіраючы ў дужках патрэбную форму займенніка.*

Патрабаваць ад (самога, самага) (сабе сябе); (сам, самы) (сабе, сябе) трэнер; аддаваць усяго (сабе, сябе); адчуваць (сабе, сябе) пераможцам; паклапаціцца аб (самым, самім) (сабе сябе); хваліць (самога, самага) сябе; дачакацца (самога, самага) яркага моманту; прыз (самому, самаму) выніковаму іграку; апынуцца ў (самым, самім) цэнтры ўвагі; браць на (сабе, сябе) (саму, самую) адказную ролю.

Дараваць (мне, мяне); звярнуцца да (мне, мяне); аддзячыць (мне, мяне); думаць пра (табе, цябе); напісаць пісьмо (табе, цябе); зрабіць дабро (табе, цябе); убачыць (табе, цябе); падзякаваць (вам, вас); павіншаваць (вам, вас); адказаць на пытанне (нам, нас); прабачыць (нам, нас); зрабіць для (табе, цябе).

## ТЭМА 15.
## Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Пунктуацыйныя нормы

***Практыкаванне 88.*** *Падбярыце беларускія адпаведнікі да рускіх словазлучэнняў. Складзіце тэкст, выкарыстаўшы некаторыя з іх.*

Два мировых рекорда, три лучших буллита, обращаться за помощью, бежать за лидером, сходить за льдом, жениться на ней, поблагодарить сервисменов, два раза в неделю, смеяться над собой, не финишировал из-за травмы, заниматься по утрам, соревнования по фристайлу, моложе всех, плыть быстрее всех, похожий на оригинал, заболеть ревматизмом, заботиться о родителях, тосковать о доме.

***Практыкаванне 89.*** *Прачытайце тэкст. Дайце яму назву. Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы. Выпішыце тэрміны, утвораныя сінтаксічным спосабам. Растлумачце значэнне выдзеленых слоў, складзіце з імі словазлучэнні.*

Фігурнае катанне – мастацкае катанне на каньках, від спорту; аднаапорныя, радзей двухапорныя ***слізганні*** па крывых лініях на рэбрах канька ў спалучэнні з паваротамі, скачкамі і ***вярчэннямі*** па вертыкальнай восі. Фігурнае катанне адрозніваецца высокай эмацыянальнасцю і выразнасцю рухаў. Складаная ***тэхніка*** фігурнага катання звязана з харэаграфічнай і музычнай падрыхтоўкай. Загартоўвае арганізм, паляпшае дыханне, павышае функцыянальную ўстойлівасць вестыбулярнага апарату, спрыяе развіццю рухальных уласцівасцей чалавека.

Падзяляецца на адзіночнае, парнае і танцы на лёдзе. Адзіночнае складаецца з абавязковых практыкаванняў (так званай школы), кароткай і адвольнай праграм. Абавязковыя практыкаванні – пэўныя ***фігуры*** (41), якія выконваюцца ў адпаведнасці з устаноўленымі ***правіламі***. Кароткая і абавязковая праграмы парнага катання складаюцца з 6 абавязковых элементаў, абавязковая праграма танцаў на лёдзе – з 15 абавязковых і арыгінальнага танца. Адвольная праграма – практыкаванні пад музыку па выбары спартсмена – уключае ў сябе розныя віды вярчэнняў, паваротаў, скачкоў (А. Шыршаў).

***Практыкаванне 90.*** *Прачытайце тэкст. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Выпішыце са сказаў дзейнікі і выказнікі, скаардынаваўшы іх формы.*

**Мінск ператвараецца ў вялікі велагорад**

У сталіцы (*прайсці* – буд. час) прэстыжныя гонкі Еўратура. Каля 150 спартсменаў з 14 краін (*прыняць* – буд. час) удзел у «Кубку Мінска» і «Гран-пры Мінска».

Гэтыя міжнародныя шашэйныя велагонкі ўнесены ў каляндар Еўратура Міжнароднага саюза веласіпедыстаў, што (*дазваляць* – цяп. час, адз. лік) спартсменам змагацца не толькі за медалі і каштоўныя прызы, але і за рэйтынгавыя ачкі, якія (*спатрэбіцца* – буд. час) спартсменам на чэмпіянатах свету, Еўропы і Алімпійскіх гульнях. Таму турніры ў Мінску (*стаць* – буд. час) досыць прадстаўнічымі, на старт (*выйсці* – буд. час) спартсмены з Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Казахстана, Азербайджана, Італіі, Польшчы, Кітая, ЗША, Ізраіля, Чэхіі і Малдовы.

Наша краіна (*быць* – буд. час) прадстаўлена практычна ўсімі наймацнейшымі велагоншчыкамі. Ад Беларусі ўдзел у спаборніцтвах (*узяць* – буд. час) пяць каманд: кантынентальная каманда «Мінск», зборная Беларусі, каманды Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі і Мінскага гарадскога цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі, а таксама зборная Мінскай вобласці.

Сёння праграму спаборніцтваў (*адкрыць* – буд.час) «Кубак Мінска», гонка працягласцю 176 км (*стартаваць* – буд. час) у $11^{00}$ ад Палаца спорту па праспекце Пераможцаў, велагоншчыкі (*выехаць* – буд. час) за горад, дзе іх (*чакаць* – цяп. час) 5 колаў даўжынёй 31,5 км вакол Мінскага мора. Пасля чаго гонка (*вярнуцца* – буд. час) у горад і арыентавана ў $15^{00}$ (*фінішаваць* – буд. час) каля Палаца спорту.

Заўтра, 9 ліпеня, (*прайсці* – буд. час) «Гран-пры Мінска» – маршрут гонкі (*пралягаць* – буд. час) па гарадскіх вуліцах, старт запланаваны на $14^{00}$. Веласіпедысты (*праехаць* – буд. час) 10 колаў па 12 км. На кожным з іх спартсменаў (*чакаць* – буд. час) прамежкавыя фінішы, за перамогі на якіх (*налічвацца* – буд. час) ачкі. Уладальнік найбольшай колькасці балаў пасля заканчэння гонкі будзе ўдастоены майкі «Самага актыўнага гоншчыка» і спецыяльнага прыза.

Арганізатары (*абяцаць* – цяп. час) стварыць цікавае мерапрыемства не толькі для прафесійных спартсменаў, але і для простых велааматараў (паводле Д. Лабажэвіч).

*Знайдзіце ў тэксце:*

*1) складаныя сказы;*

*2) сказы з аднароднымі членамі, якія адпавядаюць наступным схемам:*

*не толькі О і О, але і О;*

*О, О і О;*

*О: О, О, О і О, а таксама О;*

*О і О;*

*не толькі О, але і О.*

*3) сказ з аднароднымі членамі і абагульняльнымі словамі;*

*4) сказ з адасобленай акалічнасцю.*

***Практыкаванне 91.*** *Выкарыстайце наступныя выказванні* (*ці іх фрагменты*) *у якасці цытат, аформіце іх як простую мову ці як частку сказа.*

Футбол – як люстэрка, якое высвечвае ўсе чалавечыя якасці: калектывізм, узаемаразуменне, гонар і сумленнасць, гатоўнасць аддаць усяго сябе справе, як кажуць футбалісты, выкласціся да апошніх сіл дзеля перамогі. Але калі ты сапраўдны спартсмен, то павінен быць і патрыётам сваёй каманды, у зборнай – патрыётам сваёй Радзімы (Эдуард Малафееў, заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны трэнер СССР).

Спорт нараджае сілу, лоўкасць, вынослівасць, выхоўвае цярпенне і веру ў будучыню (Аляксандр Мядзведзь, трохразовы алімпійскі чэмпіён па вольнай барацьбе, уладальнік спецыяльнага прыза ЮНЕСКА «За высакароднасць у спорце»).

Імгненню, калі ты ўзыходзіш на п’едэстал, папярэднічаюць дзясяткі гадоў пякельнай працы. Ты ахвяруеш здароўем, часам, асабістым жыццём… Усё падпарадкоўваецца спорту. І калі чагосьці дасягаеш, разумееш, зроблена гэта было недарэмна. Спорт – неад’емная частка жыцця. Філасофія. Без яго не можаш жыць (з інтэрв’ю старшыні Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзіма Дзевятоўскага карэспандэнту газеты «Звязда»).

***Практыкаванне 92.*** *Паразважайце на тэму «Як далучыць дзяцей да заняткаў спортам* (*да здаровага ладу жыцця*)*». У сваім выказванні выкарыстайце прапанаваныя словы і словазлучэнні. Запішыце створаны тэкст, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.*

На маю думку, безумоўна, хутчэй за ўсё, па-мойму, шчыра кажучы, аднак, праўда, на маё здзіўленне, адным словам, напэўна.

***Практыкаванне 93***. *Запішыце сказы* (*аўтар – карэспандэнт газеты «Звязда» Д. Лабажэвіч*). *Расстаўце знакі прыпынку, абгрунтуйце свой выбар.*

1) Можа хтосьці здзівіцца але ж ганяць шайбу па лёдзе прадстаўніцы прыгожага полу пачалі ўжо даўно ў 1889 годзе вядома ж у Канадзе. Першымі дамамі якія сур’ёзна ўзяліся за клюшкі былі жонка і дочкі знакамітага спадара Стэнлі. Праўда прафесійныя жаночыя каманды з’явіліся значна пазней а першы міжнародны турнір адбыўся толькі ў 1987 годзе.

2) У якасці пакрыцця беларуская каманда выбрала хард таму матчы чакаюцца хуткімі і спадзяёмся стануць пераможнымі для нашай каманды.

3) Страх быў напэўна толькі ў дзяцінстве а калі ты ўсё жыццё гэтым займаешся то атрымліваеш ад спуску са схілу толькі задавальненне (з інтэрв’ю з Марынай Шканавай).

4) Самы прыгожы і напэўна самы вытанчаны від воднага спорту ў якім разам сплецены гімнастычныя практыкаванні танцавальныя рухі і нават балетныя трукі сабраў у Палацы воднага спорту неабыякавых да атлетычнай прыгажосці.

5) Бясспрэчна самай яркай падзеяй Алімпійскіх гульняў 2016 года для ўсіх беларусаў стала выступленне батутыста Уладзіслава Ганчарова які прынёс у скарбонку краіны адзіную залатую ўзнагароду. У фінальным скачку ён абыграў самых прынцыповых сапернікаў кітайцаў і ўпершыню ў гісторыі беларускага спорту заваяваў алімпійскі медаль у гэтым відзе праграмы.

6) Стаўшы часткай легенды Канстанцін Шаравараў застаў залаты час мінскага клуба са СКА выйграў самыя прэстыжныя тытулы а акрамя гэтага са зборнай Савецкага Саюза заваяваў алімпійскае золата ў Сеуле.

7) У нашай дружыны ў нядзельны вечар не атрымлівалася нічога раз-пораз правальвалася абарона кідкі задняй лініі часта не даходзілі да мэты не дапамагалі і галкіперы.

8) Дарэчы, у масавым гіравым спорце беларусы зараз найлепшыя ў свеце, ім належаць дасягненні ва ўсіх пяці намінацыях, якія прызнаны лонданскай штаб-кватэрай Кнігі рэкордаў Гінеса.

9) Пакуль я задаволеная той рабочай атмасферай якая склалася ў калектыве. Усе дзяўчаты працуюць з поўнай самааддачай і гэта не можа не радаваць. Трэнерскі штаб у сваю чаргу стараецца разнастаіць трэніровачны працэс зрабіць яго максімальна насычаным і цікавым. Робім акцэнт на тым каб звыклая манатонная і цяжкая агульная фізічная падрыхтоўка праходзіла не толькі інтэнсіўна але і ўключала ў сябе шмат новых развіваючых практыкаванняў пракаменціравала Наталля Трафімава.

10) У свае 19 Мікіта Цыркун здабыў пуцёўку на Гульні і ўвайшоў у 30 самых лепшых віндсёрфінгістаў свету што зусім нядрэнна для прадстаўніка краіны якая не мае выхаду да мора. У дзяцінстве хлопец сур’ёзна захапляўся шахматамі адчуваў цягу да дакладных навук а цяпер ён скарае хвалі.

*Праверце правільнасць выканання задання* (*ключ змешчаны ў Дадатку 2*).

***Практыкаванне 94.*** *З асобных сказаў складзіце і запішыце тэкст. Падзяліце яго на абзацы. Расстаўце знакі прыпынку і растлумачце іх пастаноўку.*

Дзясяткі разоў Вадзік чуў гэтую музыку і кожны раз калі яна гучала (выходзіў ён на поле ці не) яго бралі дрыжыкі. Суддзя паставіў мяч на цэнтр зірнуў на секундамер кінуў погляд на аднаго капітана каманды затым на другога тыя паднялі правыя рукі ўверх усё гатова можна пачынаць. Каманды выбягалі ў цэнтр выстройваліся з двух бакоў суддзяў. Не раз у шумлівай кампаніі ён бачыў як сціхалі пачуўшы з рэпрадуктара гукі марша здаровыя дзецюкі і важныя мужы супакойвалі другіх Ціха Дайце паслухаць! У футбольным маршы ён здаецца бачыў імклівыя рыўкі ігракоў акрабатычныя скачкі варатароў пругкі лёт мяча… А яшчэ ў гэтых акордах яму чулася радасць перамогі і светлая надзея. Марш запоўніў чашу стадыёна ацішыў гул балельшчыкаў. Вадзік зірнуў на поле ігракі прывітальна памахалі балельшчыкам разышліся на свае палавіны. Апошнія акорды марша здаецца заклікалі да барацьбы барацьбы сумленнай і цяжкай барацьбы да апошніх сіл… Над ціхім стадыёнам рэзка прагучаў судзейскі свісток (А. Камароўскі).

*Праверце правільнасць выканання задання* (*ключ змешчаны ў Дадатку 2*).

***Практыкаванне 95.*** *Тэрміналагічны практыкум.*

✧ *Запішыце сказ, у якім азначэнне тэрміна акрэслена правільна*:

1) Стральба стэндавая – адзін з відаў спорту, у якім страляюць з лука стрэламі па мішэні; 2) Скачкі на батуце – высокія падскокі з пераваротамі і вярчэннямі, індывідуальныя і сінхронныя на батуце – плеценай сетцы, замацаванай на раме з дапамогай амартызатараў. 3) Пяцібор’е сучаснае – спартыўныя комплексныя спаборніцтвы, якія ўключаюць некалькі відаў бегу, скачкоў і кіданняў.

✧ *Вызначыце спосаб утварэння тэрмінаў.*

✧ *Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў запісаным азначэнні.*

## ТЭМА 16.
## Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў

***Практыкаванне 96***. *Выпішыце асобна словы нейтральныя і стылістычна афарбаваныя. Пасля стылістычна афарбаваных слоў пазначце стылістычную памету (разм., кніжн.). Звярайце свой выбар са слоўнікамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы.*

Роля, місія; абдымкі, абоймы; адасобленасць, адарванасць, ізаляцыя, ізаляванасць; адвага, смеласць, мужнасць, рыцарства; адважны, смелы, мужны, доблесны; адвячорак, шэрая гадзіна; адкуль, скуль; адпаведнасць, гармонія; адрозненне, розніца, кантраст; адчуванне, пачуццё, інстынкт; акружыць, блакіраваць; апошні, канцавы, фінальны, развітальны; баяцца, дрэйфіць; бясплатна, дарам, дармагалам; вучань, школьнік, шкаляр; размова, гутарка, звягня; дабрадзей, філантроп; доктар, урач, лекар, эскулап; загад, прадпісанне, дырэктыва, цыркуляр; злавіць, сцапаць; знаёмства, блат; знак, эмблема; зноў, зноўку; канец, завяршэнне, фінал; канькі, нажавікі; каток, коўзанка, каўзель; кроў, юшка; лоб, лабаціна, чало; няўдача, фіяска; паведаміць, давесці да ведама; неабходнасць, надоба; развіццё, прагрэс; герой, адважны, зух, рызыкант; столькі, гэтулькі; тлумачыць, інтэрпрэтаваць.

***Практыкаванне 97.*** *Прачытайце ўрыўкі. Вызначыце, да якіх функцыянальных стыляў, падстыляў і жанраў адносяцца гэтыя тэксты. Абгрунтуйце сваю думку* (*назавіце сферу выкарыстання, мэты зносін, стылёвыя рысы*).

*Як змест і мэтанакіраванасць выказванняў уплываюць на выбар стылю?*

**I.** Вядомы спецыяліст Людас Румбуціс стаў новым галоўным трэнерам маладзёжнай зборнай Беларусі (U-21) па футболе. Яго кандыдатура зацверджана сёння на пасяджэнні выканкама асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола», паведамляе карэспандэнт БелТА. Людас Румбуціс, якому цяпер 61 год, сваю гульнявую кар’еру пачаў у 1974 г. у вільнюскім «Жальгірысе», а ў наступным годзе перайшоў у мінскае «Дынама» і стаў у яго складзе чэмпіёнам (1982) і бронзавым прызёрам (1983) чэмпіянату Савецкага Саюза. Трэнерскую кар’еру новы настаўнік беларускай «маладзёжкі» пачынаў у мінскай «Змене», потым працаваў у брэсцкім і мінскім «Дынама», «Маладзечна», бабруйскай «Белшыне», гродзенскім «Нёмане», мінскім «Партызане» і «Дарыдзе». У гэтым сезоне новым падапечным Людаса Румбуціса давядзецца стартаваць у адборачным турніры маладзёжнага чэмпіянату Еўропы-2019. Беларусы выступяць у 1-й кваліфікацыйнай групе разам з футбалістамі Харватыі, Чэхіі, Грэцыі, Малдовы і Сан-Марына. Пераможцы 9 адборачных груп атрымаюць пуцёўкі ў фінальную стадыю маладзёжнага Еўра. Чатыры лепшыя ўладальнікі другіх месц будуць разбіты на дзве пары і правядуць стыкавыя матчы. Вырашальная стадыя кантынентальнага форуму пройдзе ў Італіі. Беларуская «маладзёжка» тройчы прымала ўдзел у фінальнай стадыі турніру. Найбольш значнага поспеху беларускія футбалісты дабіліся ў 2011 г. у Даніі, калі занялі трэцяе месца і атрымалі права згуляць на Алімпіядзе-2012 у Лондане (БелТА).

**II.** Футбол – самая папулярная камандная гульня ў свеце. Гісторыя «нажнога мяча» налічвае нямала стагоддзяў. У розныя гульні з мячом, падобныя да футбола, гулялі ў краінах Старажытнага Усходу (Егіпет, Кітай), у антычным свеце (Грэцыя, Рым), у Францыі («па суль»), у Італіі («кальчыа») і ў Англіі. Непасрэдным папярэднікам еўрапейскага футбола быў, па ўсёй верагоднасці, рымскі «гарпастум». У гэтай гульні, якая была адным з відаў ваеннай трэніроўкі легіянераў, трэба было правесці мяч паміж дзвюма стойкамі. У Старажытным Егіпце падобная да футбола гульня была вядомая ў 1900 г. да н. э. У Старажытнай Грэцыі гульня ў мяч была папулярная ў розных праявах у IV ст. да н. э., пра што сведчыць малюнак з юнаком, што жанглюе мячом, змешчаны на старажытнагрэчаскай амфары, якая захоўваецца ў музеі ў Афінах. Сярод воінаў Спарты была папулярная гульня ў мяч «эпіскірас», у якую гулялі і рукамі і нагамі. Гэтую гульню рымляне назвалі «гарпастум» («ручны мяч») і некалькі змянілі правілы (паводле выдання «Белорусский олимпийский учебник»).

**III.** У вольны час мы любілі гуляць у футбол. Любілі – нават не тое слова; лепш сказаць, мы самаахвярна, адрынута ад іншых захапленняў і ўцех ганялі мяч, адчуваючы велізарную страсць у гульні, забітых галах, у перамозе, а таксама адчуваючы моцную горасць ад прапушчаных галоў і прыкрых паражэнняў.

Нашы бацькі часта наракалі на такую нашу заўзятую захопленасць, бо мы хутка збівалі свой абутак, дралі адзенне, бывала, і скалечваліся, пераставалі быць памочнікамі пры доме – а, як усе ведаюць, работы па гаспадарцы ў вёсцы вельмі шмат, бацькі самі ўсяго перарабіць не могуць. Для нашых бацькоў было, канечне, мала толку ад таго, што мы дацямна бегалі па футбольным полі, галёкалі, перажываючы то горыч, то прыемнае ўзрушэнне, але для нас, кажу, у гульні была вялікая радасць: мы не толькі загартоўваліся, але і добра навучваліся гуляць у футбол, усё часцей і часцей абыгрывалі футбольныя каманды з суседніх вёсак. Вось і тады, неўзабаве пасля школы, да мяне зайшлі мае сябры Янка, Віця. Мы зашылі ў мячы дзірку (ні суравыя ніткі, ні дратва не вытрымлівалі нашых бязлітасных удараў па сухім ці мокрым мячы, ірваліся), напампавалі паветра і рушылі на футбольнае поле (Г. Далідовіч. «Страта»).

**IV.** – *Што скажаце пра якасць футбола на чэмпіянаце?*

– Для мяне, як для трэнера, гэты турнір нічога новага не прыўнёс. Два папярэднія еўрапейскія першынствы выйгравала зборная Іспаніі, і дамінаваў атакуючы футбол, гэты чэмпіянат выйграла Партугалія, якая прапагандавала абарончую гульню. Такая сістэма не дае прагрэсу. Увесь футбол спрадвеку пабудаваны на праціборстве нападзення і абароны. Сёлета Еўра нагадаў мне чэмпіянат свету 2004 года, калі выйграла зборная Грэцыі. Яны ўвесь час закрываліся, абы забіць адзін гол, партугальцы рабілі тое ж самае.

З іншага боку, гэты чэмпіянат паказаў важнасць трэнера ў камандзе. Партугальскі настаўнік, напрыклад, маючы пэўны набор гульцоў і ведаючы магчымасць сваёй каманды, правільна выбудаваў і тактыку, і стратэгію і так дамогся выніку. Тое самае можна сказаць пра трэнераў Ісландыі і Уэльса, яны па максімуме выкарыстоўвалі магчымасці сваёй каманды.

Мне асабіста найбольш імпанавала гульня Германіі, я лічу, што лёс адвярнуўся ад іх, недзе ім не пашанцавала. З пункту гледжання зместу гульні, немцы былі найбольш цікавыя, наогул паўфінальны матч Францыя – Германія, я лічу, быў самым яскравым на чэмпіянаце.

– *Думаю, у балельшчыкаў магло ўзнікнуць пытанне: ці вартыя партугальцы звання чэмпіёнаў?*

– Калі людзі выйгралі, значыць, яны вартыя. Яны перамаглі не ў адным выпадковым матчы. Зборная Партугаліі прайшла ўвесь турнір разам з усімі, а як яны гэтага дамагліся і якія сродкі выкарыстоўвалі... гэта проста выдатная праца трэнера («Звязда», урывак з інтэрв’ю з Э. В. Малафеевым).

**V.** Дыега Марадона – аргенцінскі футбаліст, які завяршыў гульнявую кар’еру, выступаў на пазіцыі нападаючага. Правёў 91 матч і забіў 34 галы ў складзе зборнай Аргенціны. Чэмпіён свету 1986 года. Віцэ-чэмпіён свету 1990 года. Удзельнік чатырох чэмпіянатаў свету. Чэмпіён свету сярод маладзёжных каманд 1979 года. Лепшы ігрок чэмпіянату свету 1986 года. Футбаліст года ў Паўднёвай Амерыцы 1979 і 1980 гадоў. Двойчы член сімвалічных зборных чэмпіянатаў свету. Чэмпіён Аргенціны ў складзе клуба «Келіх Хуніёрс». Двухразовы чэмпіён Італіі ў складзе клуба «Напалі».

Лепшы футбаліст XX ст. па галасаванні на афіцыйным сайце ФІФА, дзе ён набраў 53,6 % галасоў; па версіі футбольнай Камісіі ФІФА, Марадона – 3-ці футбаліст у XX стагоддзі. Па апытанні МФФІС займае 5-е месца сярод лепшых футбалістаў свету XX стагоддзя. Займае 2-е месца сярод лепшых ігракоў XX ст. па версіі часопіса World Soccer. З’яўляецца лепшым футбалістам у гісторыі чэмпіянатаў свету па версіі газеты The Times. Уваходзіць у ФІФА 100.

Член сімвалічнай зборнай лепшых ігракоў на ўсіх чэмпіянатах свету па версіі ФІФА. Член сімвалічнай зборнай лепшых ігракоў у гісторыі Паўднёвай Амерыкі. У 1999 г. Марадона быў прызнаны лепшым спартсменам XX ст. у Аргенціне. Аўтар гола ў вароты зборнай Англіі, які атрымаў назву «Гол стагоддзя», і прызнанага лепшым голам у гісторыі чэмпіянатаў свету; у той жа гульні забіў мяч рукой, гэты выпадак вядомы як «Рука Бога».

Марадона з'яўляецца ганаровым грамадзянінам Буэнас-Айрэса. Імем Дыега названы стадыён клуба «Архенцінас Хуніёрс», адкрыты 26 снежня 2003 г. у дзень яго дэбюту ў складзе каманды. У чэрвені 2005 г. Марадона атрымаў прэмію Фаўстына Сарміента ад аргенцінскага сената.

Пасля завяршэння кар'еры ігрок Марадона працаваў тэлекаментатарам на каналах Аргенціны і Італіі. З чэрвеня 2005 па жнівень 2006 г. быў віцэ-прэзідэнтам футбольнай камісіі клуба «Келіх Хуніёрс». Зняўся ў некалькіх фільмах.

З кастрычніка 2008 г. Марадона – галоўны трэнер зборнай Аргенціны, з якой дайшоў да чвэрцьфіналу чэмпіянату свету 2010 (www.peoples.ru).

**VI.** Футбол (ад англ. football, ад foot – нага, ball – мяч) – спартыўная камандная гульня з мячом на спецыяльнай пляцоўцы (полі) з варотамі, у якой кожная з каманд ударамі ног імкнецца забіць мяч у вароты праціўніка. Памеры футбольнага поля – 90–120 на 45–90 метраў, працягласць гульні – 90 хвілін (2 таймы па 45 хвілін з перапынкам 15 хвілін). У цяперашні час з'яўляецца самым папулярным і масавым відам спорту ў свеце.

***Практыкаванне 98.*** *Падбярыце беларускамоўныя тэксты навуковага, афіцыйна-справавога, публіцыстычнага і мастацкага стыляў, аб'яднаных адной тэмай «Спартыўныя гульні» або «Алімпійскія віды спорту». Вызначыце стылістычныя асаблівасці гэтых тэкстаў.*

***Практыкаванне 99***. *Прачытайце азначэнні вядомых спартыўных паняццяў. Знайдзіце ў прапанаваных тэкстах словы, неўласцівыя навуковаму стылю. Выпраўце тэрміналагічныя даведкі так, каб іх змест адпавядаваў патрабаванням навуковага стылю.*

*Атака ў галаву ці шыю* – парушэнне, паляганае ў тым, што гулец накіроўвае любы від удару/боцу часткай свайго цела ці рыштунку ў галаву ці шыю спадужніка, альбо з сілай накіроўвае яго галаву ў борт ці ахоўнае шкло. Караецца адным ці некалькімі штрафамі.

*Брамнік* (*галкіпер*) – гулец, абавязкам якога з'яўляецца абарона брамы. Калі брамнік чыніць правіну, караную двух- ці пяціхвілінным выдаленнем, ён застаецца ў браме, а пакаранне замест яго адбывае адзін з палявых гульцоў.

*Затрым/затрымка* – парушэнне, каранае малым штрафам, калі гулец з дапамогай адной ці абедзвюх рук, нагамі ці якім іншым чынам замінае рухацца спадужніку, не валоднаму шайбай.

*Інсайд* – у хакеі гэта паўсярэдні нападач: гулец, які займае ў лініі нападу становішча паміж крайнімі і цэнтральнымі гульцамі.

*Кваліфікацыя* – ровень падрыхтоўкі спартоўцаў, трэнераў, суддзяў.

*Крайні/край* – так скарочана называюць таго, хто дзеіць каля краю, па краі, займае пазіцыю блізу бакавой лініі пляцоўкі пры расстаўлянні каманды.

*Стан баявой гатоўнасці* – самая спрыяльная і высокая ступень гатовасці спартоўца да гульні.

*Тэхніка руху* – датычна хакею гэты занятак улучае ў сябе такія дзеянні, як бег, павароты, тармажэнні і супыны, старты і скачкі.

*Узяцце брамы* – тое ж, што і гол: забіты ці прапушчаны ў браму мяч; канчатная мэта гульні, паляганая ў тым, каб мяч поўнасцю перасек лінію сапернай брамы паміж стойкамі пад перакладзінай.

*Вылучаны форвард* – нападач, які дзеіць на гастрыі атакі, якому партнёры па камандзе імкнуцца адрасаваць свае перадачы.

***Практыкаванне 100.*** *Прачытайце і перакладзіце на беларускую мову азначэнні некаторых жанраў афіцыйна-справавога стылю. Да якога падстылю, на вашу думку, яны адносяцца? Якія яшчэ жанры афіцыйна-справавога стылю вы ведаеце? Пералічыце. Што вы пра іх ведаеце?*

Приказ – правовой акт, издаваемый руководителем организации для разрешения основных задач, стоящих перед организацией.

Решение – правовой акт, принимаемый коллегиальными органами организации и его структурными подразделениями.

Протокол – документ, в котором фиксируется ход обсуждения вопросов и принятия решений на заседаниях.

Докладная записка – информационный документ, адресуемый вышестоящему руководителю в порядке прямого подчинения и содержащий обстоятельное изложение какого-либо вопроса с выводами и предложениями составителя.

Справка – информационный документ, содержащий описание и (или) подтверждение тех или иных фактов служебного или биографического характера. Справка содержит констатацию каких-либо фактов без мнения автора о существе излагаемых вопросов.

Служебная справка – официальный документ, содержащий сведения об основной деятельности организации (о штатной численности, о выполнении планов, заданий и др.).

Личная справка – официальный документ, подтверждающий сведения биографического и (или) служебного характера и выдаваемый частному лицу (о месте работы и занимаемой должности, о периоде работы, о размере заработной платы и др.).

Письмо – обобщённое название различных по содержанию документов, выделяемое в связи с особым способом передачи текста (пересылка по почте и другим каналам связи). В зависмости от содержания различаются следующие разновидности служебных писем: письма-запросы, письма-ответы, письма сопроводительные, рекламационные, гарантийные, напоминания, извещения, приглашения и др. («Инструкция по делопроизводству»).

***Практыкаванне 101.*** *Выпішыце з «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы» азначэнні наступных лексічных адзінак, якія называюць жанры навуковага і публіцыстычнага стыляў.*

Навуковы стыль: тэзіс, манаграфія, анатацыя, рэферат, даклад, артыкул, рэзюмэ.

Публіцыстычны стыль: нарыс, фельетон, пракламацыя, адозва, лозунг.

***Практыкаванне 102***. *Перакладзіце тэкст на беларускую мову.*

*Вызначыце стыль тэксту. Назавіце словы, характэрныя для гэтага стылю. Як называюцца такія словы?*

Личность – понятие многогранное и глобальное. Чаще всего личность определяют как человека в совокупности его социальных, приобретённых качеств. В понятие «личность» обычно включают свойства, которые являются более или менее устойчивыми и свидетельствуют об индивидуальности человека, определяя его значимые для людей поступки.

Структуру личности составляют: способности, темперамент, характер, волевые качества, эмоции, мотивация, социальные установки.

Способности – индивидуальные устойчивые свойства человека, определяющие его успехи в различных видах деятельности.

Темперамент – качества, от которых зависят реакции человека на других людей и социальные обстоятельства.

Характер – качества, определяющие поступки человека в отношении других людей.

Волевые качества – специальные личностные свойства, влияющие на стремление человека к достижению поставленных целей.

Эмоции и мотивация – переживания и побуждения к деятельности.

Социальные установки – убеждения и отношения людей.

Личность – продукт социально-исторического развития и собственной деятельности человека. Она обладает сознанием и системой социальных качеств, выполняет определённые функции в обществе. В спорте, как и в других видах деятельности человека, большое значение имеет индивидуальность. Достижение успеха возможно лишь при правильном

учёте индивидуальных особенностей личности спортсмена и при формировании на этой основе специфического технико-тактического стиля его деятельности.

Лишь зная индивидуальные особенности личности спортсмена, можно наиболее полно развить и эффективно использовать его возможности («Психология физического воспитания и спорта»).

***Практыкаванне 103.*** *Тэрміналагічны практыкум.*

✧ *Назавіце тэрміналагічнае значэнне слоў:*

*Вароты – гэта…* 1) шырокі праезд у сцяне, плоце, які закрываецца створкамі або закладваецца жардзінамі, 2) строга акрэсленая і вылучаная частка прасторы на полі, якая абараняецца кожнай камандай, 3) пункт, праз які ажыццяўляецца інтэнсіўная сувязь з навакольным светам.

*Карзіна – гэта…* 1) плецены выраб з лучыны, лазы і пад. для захоўвання і пераноскі чаго-небудзь, 2) гандола аэрастата, 3) сетка на абручы, у якую закідваюць мяч.

*Луза – гэта…* 1) адтуліна на краі більярднага стала, у якую падае шар, 2) ямка на полі для гольфа, 3) нізіна.

✧ *Вызначыце спосаб утварэння тэрмінаў.*

✧ *Вызначыце стылістычную афарбоўку слоў.*

***Практыкаванне 104.*** *Прачытайце тэксты. Вызначыце іх стылёвую прыналежнасць.*

*Прааналізуйце тэксты па наступнай схеме*: 1) *сфера зносін*; 2) *асноўная функцыя*; 3) *падстыль*; 4) *жанр*; 5) *стылеўтваральныя рысы*; 6) *лексічна-фразеалагічныя асаблівасці*; 7) *марфалагічныя асаблівасці*; 8) *сінтаксічныя асаблівасці*.

**I.** У год, калі праходзяць Алімпійскія гульні, летнія або зімовыя, для спартсменаў і ўсіх людзей у свеце спорту не можа быць спаборніцтваў больш важных і прэстыжных, чым Алімпіяда. Гульні-2016 яшчэ да свайго пачатку нарабілі шмат шуму і абяцалі стаць аднымі з самых скандальных. Перш за ўсё, гэта звязана з палітычнымі і эканамічнымі праблемамі прымаючай краіны – Бразіліі. Негатоўнасць спартыўных аб’ектаў, недабудаваная алімпійская вёска, недастатковыя меры бяспекі – усё гэта было, і часам ці то журналісцкія выдумкі, ці то рэчаіснасць наогул ставілі Алімпіяду ў Рыа-дэ-Жанэйра пад пагрозу зрыву. Па меры набліжэння галоўных стартаў узнікла яшчэ адна вострая праблема – допінг. Шэраг скандалаў на гэтую тэму пракаціўся, здаецца, па ўсім свеце, закрануўшы самыя магутныя спартыўныя дзяржавы. Абвінавачванні прад’яўляліся асобным спартсменам, федэрацыям і цэлым краінам. Часам гэтыя абвінавачванні ставіліся пад сумненне і выглядалі цалкам неабгрунтаванымі. Такая несправядлівасць не абмінула і нашу краіну: напярэдадні адлёту ў Бразілію былі дыскваліфікаваныя нашы весляры. Нягледзячы на ўзмоцненую барацьбу спартыўных чыноўнікаў, не атрымалася вярнуць мужчынскую зборную ў Рыа, тым самым, магчыма, мы не далічыліся некалькіх алімпійскіх медалёў. Шкада.

Але, нягледзячы на ўсё, Алімпіяда ў Рыа адбылася, там былі перамогі, рэкорды і слёзы паражэнняў – усё як мае быць. Яна ўсё роўна стала вялікім спартыўным святам (www.zviazda.by).

**II.** Некаторыя тэрміны англійскага паходжання складаюць прадметна-тэматычную групу найменняў: 1) адметныя назвы пэўных частак спартыўных спаборніцтваў, гульняў (6 адзінак): гейм (ад англ. game); хаўтайм (ад англ. halftime); раўнд (ад англ. round); сэт (ад англ. set); тайм (ад англ. time); тайм-аўт (ад англ. time-out); 2) пэўная частка тэрмінаў-англіцызмаў належыць да коннага віду спорту (6 адзінак): трот (ад англ. trot); фляер (ад англ. flier); стыплер (ад англ. steepler); гунтар (ад англ. hunter); гіт (ад англ. heat); стаер (ад англ. stayer); 3) адзінкавыя англіцызмы называюць стан спартсмена ў пэўным відзе спорту (2 адзінкі): накаўт (ад англ. knockout); накдаўн (ад англ. knock-down). Як паказвае аналіз, беларуская спартыўная тэрміналогія значна ўзбагацілася за кошт англійскіх лексемаў. Улічваючы, што англійская мова з’яўляецца папулярнай у наш час, яе спартыўныя тэрміны будуць актыўна папаўняць

слоўнікавы склад беларускай мовы ў названым лексічна-семантычным разрадзе (паводле Л. Я. Кавалёвай).

**III.** У 2014 г. чэмпіянат свету па хакеі ўпершыню прайшоў у Беларусі. Такое рашэнне было прынята ў маі 2009 г. на штогадовым кангрэсе Міжнароднай федэрацыі хакея з шайбай (ІІХФ). Па выніках галасавання ў падтрымку Рэспублікі Беларусь было аддадзена 75 галасоў са 105 магчымых.

Міжнародная федэрацыя хакея заўсёды звяртала ўвагу на магчымасці Беларусі пры правядзенні прэстыжных спаборніцтваў. Толькі ў 2004 г. у Беларусі праходзілі дзве буйныя падзеі – Суперфінал Кантынентальнага кубка і Чэмпіянат свету ІІХФ сярод юніёраў. З таго часу Беларусь неаднаразова прымала хакейныя турніры.

78-ы Чэмпіянат свету па хакеі з шайбай прайшоў у Мінску з 9 па 25 мая 2014 г. У ім прынялі ўдзел 16 нацыянальных каманд. Афіцыйным талісманам чэмпіянату свету па хакеі з шайбай-2014 стаў зубр па імені Волат.

На час турніру Беларусь устанавіла бязвізавы парадак уезду ў перыяд з 25 красавіка па 31 мая 2014 г. для афіцыйных удзельнікаў чэмпіянату свету па хакеі і замежных турыстаў. Адпаведны Указ падпісаў Кіраўнік дзяржавы. Падставай для бязвізавага ўезду ў Беларусь для афіцыйных удзельнікаў чэмпіянату было ўключэнне іх у спісы афіцыйнай акрэдытацыйнай сістэмы чэмпіянату Міжнароднай федэрацыі хакея, а для турыстаў – наяўнасць арыгінальнага або электроннага білета на матчы чэмпіянату (www.president.gov.by).

***Практыкаванне 105***. *Прачытайце тэкст. Вызначыце, да якога стылю яго можна аднесці. На вашу думку, моўныя асаблівасці якіх функцыянальных стыляў прысутнічаюць у гэтым тэксце? Выпішыце лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя моўныя сродкі названых вамі стыляў.*

Арганізатары ўносяць апошнія штрыхі ў падрыхтоўку арэн, трэнеры абвяшчаюць канчатковыя склады камандаў, тым часам у заўзятараў яшчэ ёсць час, каб паклапаціцца пра пакупку білетаў і канчаткова разабрацца ў правілах футзала.

Асноўная цяжкасць заключаецца ў тым, што часта аматары спорту блытаюць футзал з міні-футболам. У цэлым гэтыя гульні маюць больш агульнага, чым адрозненняў, але ёсць прынцыповыя моманты, якія робяць іх зусім рознымі. Гэта датычыцца як гульнявой, так і арганізацыйнай часткі.

Спаборніцтвы па футболе ў залах праходзяць пад эгідай Міжнароднай асацыяцыі футзала (AMF), а спаборніцтвы па міні-футболе – пад эгідай Міжнароднай федэрацыі футбольных асацыяцый (FIFA). І футзал, і міні-футбол у Беларусі маюць свае федэрацыі.

За мяжой міні-футбол называюць «футзал FIFA», футбол у залах жа носіць назву – «футзал». Футзал прадстаўлены ў 33 краінах свету, 12 краінах Еўропы. Міні-футбол культывіруюць 160 краін – членаў FIFA, у Еўропе – 50 з 53-х членаў УЕФА.

Што тычыцца гульнявых правілаў, то яны маюць шмат агульнага:

– колькасць гульцоў (у пратакол гульні ўносіцца 12 гульцоў, пяць з якіх, уключаючы варатара, пачынаюць гульню);

– пляцоўка (павінна мець форму прамавугольніка, для міжнародных матчаў мінімальная даўжыня – 36 м, шырыня 18 м);

– камандныя фалы.

Адрозненні складаюцца ў наступным:

– пры гульні ў футзал па правілах мяч уводзяць у гульню з аўта і пры вуглавым рукамі, тады як міні-футбольныя правілы абавязваюць гульцоў уводзіць мяч нагамі з бакавой лініі;

– у футзале правілы не абмяжоўваюць гульцоў у перадачах свайму варатару і дазваляюць камандзе гуляць на сваёй палове не больш за 15 секундаў. Міні-футбол не абмяжоўвае знаходжанне гульцоў на сваёй палове, але дапускае не больш за адну перадачу варатару перад выхадам на чужую палову. Мяч у варатара на сваёй палове поля можа знаходзіцца не больш за 4 секунды;

– у міні-футболе пры выдаленні гульца каманда застаецца ў меншасці на дзве хвіліны. У футзале можна зрабіць замену адразу ж, пры атрыманні сіняй карткі. Чырвоная картка, якая пакідае каманду ў меншасці, даецца толькі за неспартыўныя паводзіны.

У абодвух відах спорту пасля пятага парушэння кожны наступны фол каманда прабівае дабл-пенальці. Дабл-пенальці – гэта ўдар з 9 метраў (футзал), з 10 метраў (міні-футбол).

Спадзяёмся, гэтыя веды дапамогуць нам убачыць усё самае лепшае, што ёсць у футзале, ужо праз пару дзён («Звязда»).

***Практыкаванне 106***. *Прачытайце тэкст. Вызначыце яго стыль, абгрунтуйце свой выбар. Прааналізуйце тэкст па наступнай схеме*: *1*) *сфера зносін*; *2*) *асноўная функцыя*; *3*) *падстыль*; *4*) *жанр*; *5*) *стылеўтваральныя рысы. Выпішыце з тэксту лексічныя і марфалагічныя моўныя сродкі, уласцівыя прадстаўленаму функцыянальнаму стылю.*

СПОРТ – гэта спаборніцкая дзейнасць, падрыхтоўка да яе, а таксама спецыфічныя адносіны, нормы і дасягненні, звязаныя з гэтай дзейнасцю. Складовая частка фізічнай культуры. Відаў спорту вельмі шмат. Вось некаторыя з іх:

– веласіпедны спорт: від спорту, у якім спартсмены спаборнічаюць на веласіпедах. Найбольш распаўсюджаныя віды – гонкі на трэку і шашы, праводзяцца таксама гонкі па перасечанай мясцовасці (велакрос), спаборніцтвы па фігурнай яздзе, гульні ў мяч на веласіпедах;

– гарналыжны спорт: від лыжнага спорту, сутнасць якога ў спуску на горных лыжах за найбольш кароткі прамежак часу па спецыяльных трасах з праходжаннем расстаўленых ў пэўным парадку варот. Уключае наступныя віды: слалам, слалам-гігант, паралельны слалам, хуткасны спуск, спуск на хуткасць, супергігант, а таксама два віды мнагабор'я: трохбор'е (хуткасны спуск, слалам-гігант, слалам) і дваяборства (хуткасны спуск і слалам або хуткасны спуск і слалам-гігант);

– конны спорт: спаборніцтвы ў верхавой яздзе на конях. Асноўныя віды: выездка, трохбор'е, пераадоленне перашкод, скачкі адзінкавыя, скокі, кросы, прабегі, стыпль-чэзы, вальтыжыроўка, джыгітоўка, конныя гульні;

– канькабежны спорт: хуткасны бег на коньках па лёдзе, пры выкананні якога канькабежац імкнецца ва ўмовах спаборніцтваў пераадолець рэгламентаваную правіламі дыстанцыю з максімальна магчымай для сябе хуткасцю. Пры хуткасным бегу выкарыстоўваюць простыя ці спецыяльныя бегавыя канькі;

– лыжны спорт: комплекс самастойных відаў спорту, які ўключае лыжныя гонкі, біятлон, скачкі на лыжах з трампліна, лыжнае дваяборства, гарналыжны спорт. Усе віды лыжнага спорту маюць вялікае прыкладное значэнне;

– санны спорт: хуткасны спуск на адна- і двухмесных гоначных санках па спецыяльных трасах (са штучным або натуральным лядовым пакрыццём), якія маюць у сярэднім 15 віражоў;

– стралковы спорт: сукупнасць некалькіх відаў спорту: кулявой стральбы, стэндавай стральбы і стральбы з лука і інш. (www.sport-dic.ru).

***Практыкаванне 107.*** *Прачытайце тэкст. Вызначыце яго стылёвую прыналежнасць. Прааналізуйце тэкст па наступнай схеме: 1) сфера зносін; 2) асноўная функцыя; 3) падстыль; 4) жанр; 5) стылеўтваральныя рысы; 6) лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя моўныя сродкі, уласцівыя прадстаўленаму функцыянальнаму стылю.*

***Артыкул 38.*** Правы і абавязкі спартсменаў

1. Спартсмены маюць права на:

выбар відаў спорту;

удзел у спартыўных спаборніцтвах па абраным відзе спорту ў парадку, устаноўленым правіламі спартыўных спаборніцтваў па віду спорту і палажэннямі аб правядзенні (рэгламентамі правядзення) спартыўных спаборніцтваў;

забеспячэнне іх бяспекі пры правядзенні фізкультурна-аздараўленчых, спартыўна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў;

прысваенне спартыўных званняў і спартыўных разрадаў пры выкананні нормаў і патрабаванняў, устаноўленых Адзінай спартыўнай класіфікацыяй Рэспублікі Беларусь;

заключэнне працоўных і (або) грамадзянска-прававых дагавораў, у тым ліку трансферных дагавораў (кантрактаў), у парадку, устаноўленым заканадаўствам;

заработную плату і (або) узнагароджанне (даход) за ажыццяўленне дзейнасці ў сферы прафесійнага спорту;

аб’яднанне ў прафесійныя саюзы, іншыя грамадскія аб’яднанні;

садзейнічанне адпаведнай федэрацыі (саюза, асацыяцыі) па віду (відах) спорту ў абароне іх правоў і законных інтарэсаў;

уключэнне ў нацыянальныя і зборныя каманды Рэспублікі Беларусь па відах спорту ў парадку, устаноўленым заканадаўствам;

матэрыяльна-тэхнічнае, медыцынскае, навукова-метадычнае і (або) іншае забеспячэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам;

ажыццяўленне іншых правоў у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

2. Спартсмены абавязаны:

выконваць патрабаванні Правіл бяспекі правядзення заняткаў фізічнай культурай і спортам;

выконваць патрабаванні Палажэння аб антыдопінгавых правілах Рэспублікі Беларусь;

прымаць удзел у спартыўных мерапрыемствах у адпаведнасці з заканадаўствам;

выконваць спартыўны рэжым;

выключаць курэнне, ужыванне алкагольных, слабаалкагольных напояў, піва, спажыванне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьваючых рэчываў;

прымаць меры, накіраваныя на захаванне і (або) удасканаленне спартыўнага майстэрства;

выконваць правілы спартыўных спаборніцтваў па віду спорту, палажэнні аб правядзенні (рэгламенты правядзення) спартыўных спаборніцтваў, у якіх яны прымаюць удзел;

выконваць заканадаўства ў сферы фізічнай культуры і спорту;

выконваць іншыя абавязкі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі (Закон Рэспублікі Беларусь «Аб фізічнай культуры і спорце»).

***Практыкаванне 108.*** *Выпішыце з тэксту Закона Рэспублікі Беларусь «Аб фізічнай культуры і спорце» моўныя штампы, або клішэ, уласцівыя афіцыйна-справавому стылю.*

***Артыкул 2.*** Заканадаўства ў сферы фізічнай культуры і спорту

1. Заканадаўства ў сферы фізічнай культуры і спорту грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і складаецца з гэтага Закона, іншых актаў заканадаўства, а таксама міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

2. Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія ўтрымліваюцца ў гэтым Законе, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь.

***Артыкул 3.*** Адказнасць за парушэнне заканадаўства ў сферы фізічнай культуры і спорту

Асобы, вінаватыя ў парушэнні заканадаўства ў сферы фізічнай культуры і спорту, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

***Артыкул 4.*** Права на занятак фізічнай культурай і спортам

1. Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь мае права на занятак фізічнай культурай і спортам.

2. Права грамадзян Рэспублікі Беларусь на занятак фізічнай культурай і спортам забяспечваецца дзяржавай пры дапамозе стварэння неабходных умоў для яго рэалізацыі, правядзення дзяржаўнай палітыкі ў сферы фізічнай культуры і спорту.

3. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь карыстаюцца правамі ў сферы фізічнай культуры і спорту нароўні з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, іншымі заканадаўчымі актамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

***Практыкаванне 109***. *Прачытайце тэксты. Вызначыце жанры, да якіх адносяцца тэксты. Які з прапанаваных тэкстаў не адносіцца да публіцыстычнага стылю? Да якога стылю вы можаце аднесці гэты тэкст? Аргументуйце свой адказ.*

*Растлумачце лексічнае значэнне выдзеленых слоў у першым тэксце.*

*Напішыце нарыс, эсэ або замалёўку пра знакамітага беларускага спартсмена, які прысвяціў сваё жыццё таму ж віду спорту, якім займаецеся і вы.*

**I.** Знакамітая беларуская біятланістка і трохразовая алімпійская чэмпіёнка Дар'я Домрачава адкрыла інтэрнэт-краму з вопраткай «для спорту і жыцця».

У краме можна набыць футболкі, ***заплечнікі***, павязкі, шапкі, ***бафы*** і многае іншае. Чакаецца, што ў самы бліжэйшы час з'явіцца англамоўная версія і магчымасць дастаўкі ў любую кропку свету.

«Вельмі спадзяюся, што, апрануўшы футболку або павязку з ***прынтам***, нехта прымусіць сябе прабегчы на кіламетр болей, паставіць маленькі асабісты рэкорд або купіць, нарэшце, ***абанемент*** у спартзалу. Займацца спортам становіцца значна прыемней, калі на табе надзета нешта, у чым ты адчуваеш сябе ўпэўнена», – адзначыла спартсменка ў афіцыйным ***рэлізе*** з нагоды адкрыцця інтэрнэт-крамы.

Для здымак ***каталога*** крамы Дар'я Домрачава запрасіла не прафесійных мадэлей, а біятлонных ***заўзятараў*** са стажам. Яна лічыць, што абсалютна ўсе людзі прыгожыя знутры і звонку.

Цяпер спартсменка знаходзіцца ў нарвежскім Шушэне і зноў сканцэнтраваная на біятлоне. Пад праект інтэрнэт-крамы сабрана каманда, якая займаецца яго рэалізацыяй. Уся прадстаўленая ў ім прадукцыя выраблена ў Беларусі, што было ўмовай Дар'і Домрачавай пры стварэнні праекта (www.novychas.by).

**II.** Домрачава Дар'я Уладзіміраўна (нар. 1986). Спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па біятлоне, заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп». У 2009 г. скончыла Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бронзавы прызёр XXI зімовых Алімпійскіх гульняў 2010 г. у Ванкуверы (Канада). У 2012 годзе за выдатныя спартыўныя дасягненні і перамогу на чэмпіянаце свету па біятлоне ўзнагароджана ордэнам Айчыны III ступені. Указам № 66 ад 17.02.2014 Д.У. Домрачавай прысвоена званне «Герой Беларусі» за высокае прафесійнае майстэрства і заваяванне трох залатых медалёў на XXII зімовых Алімпійскіх гульнях 2014 г. у Сочы (Расійская Федэрацыя) (www.president.gov.by).

**III.** Беларуская біятланістка падзялілася пачуццямі пасля перамогі ў індывідуальнай гонцы на Алімпіядзе ў Сочы.

*– Не думала аб тым, што бегла пад 13 нумарам, як учора Мартэн Фуркад?*

– Так, нехта з каманды нават сказаў: «Фуркад перамог, значыць, ты таксама павінна».

*– Што самае галоўнае на Алімпіядзе: падрыхтоўка або псіхалогія?*

– У біятлоне шмат нюансаў, вынік залежыць ад шматлікіх складнікаў. У першую чаргу гэта, вядома ж, добрая падрыхтоўка. У апошні месяц перад Гульнямі важна захаваць форму, захаваць здароўе. Я нават ахвяравала цырымоніяй адкрыцця, каб трохі падстрахавацца і не падчапіць інфекцыю.

Вядома, у апошні месяц важна падрыхтаваць сябе маральна да магчымасці добра выступіць. Вялікі ўнёсак у вынік робіць падрыхтоўка лыжаў і праца сэрвіснай брыгады, тым больш тут, у складаных умовах надвор'я, калі мы выпрабоўваем лыжы пры адной тэмпературы, а бегчы прыходзіцца пры іншай. Яны з гэтым спраўляюцца, малайцы.

*– Што адчувае чалавек, у якога стала на адну мару менш?*

– Алімпійскай чэмпіёнкай можна быць аднаразовай, шматразовай... Гэтая мара можа працягвацца яшчэ і яшчэ (www.sports.ru.).

**IV.** Нягледзячы на тое, што з дзяцінства большую частку часу Дар’я Домрачава прысвячае спорту, яна паспявала і добра вучыцца. Абараніўшы дыплом Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «Эканоміка і кіраванне турызмам» (2009 г.), праслаўленая біятланістка адразу ж паступіла атрымліваць другую вышэйшую адукацыю («Гаспадарчае права»).

У спартсменкі ёсць фільм-відэадзённік «Дар’я Домрачава. Прадстаўляючы Беларусь» (2010 г.), дзе яна расказвае пра свет вялікага спорту, жыццё ў камандзе, свае першыя перамогі.

У 2010 г., пасля зімовых Гульняў у Ванкуверы, Белпошта выпусціла маркі, прысвечаныя алімпійцам, у тым ліку і Дар’і Домрачавай.

Па выніках 2010 года Дар’я Домрачава стала «Спартсменкай года» ў Беларусі, а таксама атрымала званне заслужанага майстра спорту.

Дар’я Домрачава і француз Сімон Фуркад сыгралі галоўныя ролі ў невялікім жартаўлівым фільме «Шпіён, які любіў біятлон», выпушчаным Міжнародным саюзам біятланістаў (IBU) да заканчэння сезона 2012/2013. У здымках, якія праходзілі ў Антхольцы, Осла, Сочы і Ханты-Мансійску, прынялі ўдзел зоркі біятлона Кайса Мякярайнен, Мартэн Фуркад, Б’ёрн Феры, Вольга Зайцава…

У ліку выдатных людзей Беларусі Дар’я Домрачава 2 ліпеня 2013 г. прыняла ўдзел у цырымоніі адкрыцця плошчы Дзяржаўнага сцяга Беларусі.

Перад Гульнямі ў Сочы Дар’я Домрачава кансультавалася па стральбе з алімпійскім чэмпіёнам Лондана-2012 «каралём малакалібернай вінтоўкі» Сяргеем Мартынавым і яго трэнерам Аляксандрам Івановым.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №66 ад 17 лютага 2014 года «за высокае прафесійнае майстэрства і выключныя спартыўныя дасягненні» Дар’і Домрачавай прысвоена званне «Герой Беларусі». Выдатная спартсменка стала першай у гісторыі краіны жанчынай, якая ўдастоена гэтага ганаровага тытула.

Дар’я Домрачава ўзнагароджана вышэйшым знакам прызнання ў лыжным спорце Нарвегіі – медалём Холменколена, які ўручаецца з 1895 г. За гісторыю толькі восем біятланістаў удастойваліся гэтай узнагароды: Андрэа Хенкель, Оле-Эйнар Б’ёрндален і Міхаэль Грайс (2011), Магдалена Нойнер і Эміл-Хегле Свендсэн (2012), Тура Бергер і Мартэн Фуркад (2013), Дар’я Домрачава (2014) (www.belarus.by).

***Практыкаванне 110.*** *Перакладзіце словы і словазлучэнні на беларускую мову. Суаднясіце іх з пэўным стылем і запоўніце табліцу.*

| Стыль | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Навуковы | Афіцыйна-справавы | Публіцыстычны | Мастацкі | Размоўны |
| | | | | |

Олимпизм, основы делопроизводства, креативный, каноэ-двойка, альтернатива, альфа и амега, физическая подготовленность, «в шоколаде», направленность к высшим достижениям, лайк, с минуты на минуту, принцип систематичности, месседж, тренер, многоборье, отметка об исполнении документа, эксклюзив, амбициозный, силовик, волатильный, бросать слова на ветер, драйв, батут, в шаговой доступности, менталитет, прорыв года, внутренняя опись документов дела, спринтерская гонка, кроль, блог, действия защитника против нападающего, присвоение квалификационной категории, клик, наименование адресата, концепт, основная стойка, попса, бросок с места, гриф согласования, нести персональную ответственность, техника вратаря, манна небесная, конкурентноспособный, собственноручная подпись, пулевая стрельба, гнобить, копипаст, стрельба из малокалиберного ружья, без задних ног, идентичность, защитная стойка, няшка, контент, хватка ракетки, тренд, дополнительные предписания и разъяснения, штрафной удар,

позиционировать, цензура, красная карточка, коррупция, финты, инновация, вывести на чистую воду.

***Практыкаванне 111.*** *Прачытайце тэкст. Вызначыце яго стылёвую прыналежнасць. Перабудуйце прапанаваны тэкст у тэкст афіцыйна-справавога стылю, выкарыстоўваючы матэрыял даведкі, і запішыце яго па-беларуску. Да якога жанру вы аднесяце створаны тэкст? У чым асаблівасці тэкстаў такога жанру?*

Всем, кто хоть немного интересуется биатлоном, да и просто спортивной жизнью, не нужно объяснять, кто такой Уле-Эйнар Бьёрндален. Это, наверное, один из самых титулованных спортсменов за всю историю биатлона. К тому же это спортсмен совершенно без возраста. Кажется, что он был всегда и всегда будет, примет участие ещё не в одной Олимпиаде и получит заслуженные награды. Тем не менее, ему уже 41 год – солидный возраст для любого вида спорта.

Уле-Эйнар Бьёрндален родился в Норвегии, в Драммене, морозным январским днём 27 января 1974 г. У Уле есть еще старший брат Даг и младший – Ханс Антон, а также две сестрёнки. Мало существует норвежских детей, которые бы не встали на лыжи и которых родители не отдали бы в лыжный спорт. Старший брат первым пошел в биатлон и стал стреляющим лыжником, Уле – уже вслед за ним. Не отставал от братьев и младший, с которым впоследствии Уле составил костяк национальной сборной по биатлону.

Биатлоном Уле занимается с 12 лет. Лыжная подготовка у него уже тогда была хорошей, так что в скором времени Уле начинает выступать на серьёзных соревнованиях. В принципе, Уле одерживал победы и в лыжном спорте, но в биатлоне его привлекло то, что нужно уметь переключаться с динамичной ходьбы на лыжах на спокойную и уравновешенную стрельбу. Это очень непросто и даётся не всем. Хотя по признанию самого спортсмена, стрельба ему давалась не очень хорошо, таланта стрелка явно не было.

Поэтому, поработав с психологом, он просто начал очень много тренироваться именно в стрельбе – 5 раз в неделю по 2 раза в день. С тех пор он сам даёт совет, что если к чему-то нет особых способностей, то нужно просто много учиться и всё получится даже лучше, чем у тех, у кого есть талант.

Его дебют состоялся, когда спортсмену было 18 лет. И это не были юниорские соревнования. В 1992 г. он принял участие в состязаниях среди серьёзных биатлонистов. А через 2 года была первая Олимпиада в Лиллехамере. Правда, эти состязания не принесли Уле наград, сказался недостаток опыта. Но уже в следующем сезоне началось его триумфальное восхождение на спортивный Олимп.

Звёздным часом Уле стали Олимпийские игры в Нагано в 1998 г., там он взял золото и серебро.

Однако наибольший триумф его ждал через четыре года в Солт-Лейк-Сити. Там он четырежды становился первым в разных гонках. В этом же году он выиграл и другие значимые соревнования. Дальше у него случались более или менее удачные сезоны. Перед сочинской Олимпиадой Уле заявлял, что она станет окончанием его спортивной карьеры. Однако показав блестящие результаты на Олимпиаде, ничуть не уступив молодым коллегам, он решил, что хотел бы еще почувствовать вкус победы и остался в спорте до чемпионата мира в Осло в 2016-м году.

Уле-Эйнара Бьёрндалена по праву называют королём биатлона, такого количества побед и заслуженных наград нет ни у кого, и никто другой так долго не удерживал личное первенство. Но такие достижения – это огромный труд самого спортсмена. По его словам, он постоянно следит за развитием спорта, за тем, что в него привносят другие, более молодые спортсмены, учится у них. Причём, для этого ему достаточно внимательно понаблюдать за их манерой выступления на соревнованиях, а потом просто скопировать. Поэтому даже в свои сорок лет он продолжает улучшать и совершенствовать свою технику (www.the-most-beautiful.ru).

***Даведка***

Уле-Эйнар Б’ёрндален (нар. Ole Einar Bjorndalen; нарадз. 27 студзеня 1974 г. у Драмене, Нарвегія) – нарвежскі біятланіст, самы тытулаваны спартсмен у гісторыі зімовых Алімпійскіх гульняў (13 медалёў, у тым ліку 8 залатых), чэмпіянатаў свету па біятлоне (20 перамог) і Кубкаў свету па біятлону (6 перамог у агульным заліку). Чатыры з чатырох магчымых перамог атрымаў Уле-Эйнар ў біятлоне на зімовых Алімпійскіх гульнях 2002 года ў Солт-Лэйк-Сіці і стаў адзіным у свеце абсалютным алімпійскім чэмпіёнам па біятлоне. Б’ёрндален атрымаў 96 асабістых перамог на этапах Кубка свету па біятлоне і лыжных гонках (95 і 1 адпаведна), а ўсяго мае 133 перамогі разам з каманднымі дысцыплінамі. Член МАК у 2014–2016 гг. Уладальнік найбольшай колькасці ўзнагарод (13) у гісторыі зімовых Алімпійскіх гульняў ва ўсіх відах спорту. Дзеліць з лыжнікам Б’ёрнам Дэлі рэкорд па колькасці тытулаў чэмпіёна зімовых Алімпійскіх гульняў (па 8). Самы ўзроставы пераможца этапаў Кубка свету і Алімпійскіх гульняў па біятлоне ў асабістых гонках (ru.wikipedia.org).

***Практыкаванне 112.*** *Прачытайце тэкст. Да якога стылю і падстылю ён адносіцца? Чаму вы так думаеце? Абгрунтуйце сваю думку.*

*Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Пераклад запішыце.*

Бессмертную идею олимпийского примирения позже назовут словом «экехейрия». Божественный олимпийский мир предписывал прекращать все споры и враждебные столкновения, делал неприкосновенным само Зевсово святилище в Олимпии. Под страхом смертельного проклятья никто не смел с оружием вторгаться на олимпийскую территорию, угрожать послам – спондофорам, которым поручалось объявлять во всех краях о предстоящем празднике. Олимпийское перемирие усмиряло разбойников на дорогах и в горных ущельях. Все едущие и идущие на Игры считались неприкосновенными. На границе олимпийского святилища атлеты, паломники и гости оставляли любое оружие. По свидетельствам историков, в Олимпии ни один грек не поднял меча на соотечественника. Когда однажды спартанский воин пересёк границу святилища, Спарте пришлось уплатить огромный денежный штраф. Когда воины Филиппа II, отца Александра Македонского, ограбили афинянина, направлявшегося на Игры, македонских атлетов не допустили к участию в состязаниях («Белорусский олимпийский учебник»).

## ТЭМА 17.
## Гісторыя фарміравання беларускай фізкультурнай і спартыўнай тэрміналогіі

***Практыкаванне 113.*** *Запоўніце табліцу. Правільнасць выканання задання праверце па слоўніку іншамоўных слоў і тлумачальным слоўніку.*

| Слова | Паходжанне | Значэнне |
|---|---|---|
| арбітр | | суддзя ў некаторых спартыўных спаборніцтвах |
| бадмінтон | | спартыўная гульня, у якой з дапамогай ракетак перакідваецца цераз сетку валан |
| батэрфляй | англ. butterfly | |
| біцэпс | лац. biceps | |
| | лац. vita = жыццё | арганічнае рэчыва, неабходнае для нармальнай жыццядзейнасці арганізма |
| | англ. wind = вецер, surfing = катанне на прыбойнай хвалі | від воднага спорту, звязаны са слізганнем па хвалях, стоячы на коркавай або пенапластавай дошцы з рухомым парусам |

***Практыкаванне 114.*** *Адкажыце на пытанні. Правільнасць сваіх адказаў праверце па тлумачальным слоўніку*.

1) Што аб'ядноўвае словы *арбітр* і *рэферы*?
2) З якой мовы паходзіць слова *самба*?
3) Ці мае форму множнага ліку слова *каноэ*?
4) Які род мае назоўнік *каратэ*?
5) Ці мае амонім слова *баксёр*?
6) Які канчатак у форме роднага склону мае слова *спорт*?
7) Ці пажадана ў афіцыйным дакуменце ўжываць слова *алімпіец*?
8) У якім значэнні слова *фігура* з'яўляецца спартыўным тэрмінам?
9) Якое са слоў з'яўляецца адназначным *фізкультура*, *здароўе*, *загартоўка*?
10) З якім пераносным значэннем ужываецца ў мове спартыўны тэрмін *цэйтнот*?
11) Ці з'яўляюцца аднакарэннымі словы *спартыўны* і *спартакіяда*?

***Практыкаванне 115.*** *Карыстаючыся слоўнікам іншамоўных слоў, вызначыце словы, якія паходзяць ад уласных назоўнікаў:*

Алімпіяда, бадмінтон, гантэль, дэрбі, пенальці, рэгбі, спартакіяда.

***Практыкаванне 116.*** *Перакладзіце на беларускую мову словы:*

Игрок, вратарь, полузащитник, площадка, ворота, угол поля, болельщик, судья, счёт, соперник.

***Практыкаванне 117.*** *Тэрміналагічны практыкум.*

✧ *Назавіце тэрміналагічнае значэнне слоў:*

*Чэмпіянат – гэта…* 1) спаборніцтва ў якой-небудзь галіне спорту паміж дзвюма камандамі або двума праціўнікамі; 2) заключная частка спартыўных спаборніцтваў, у якой выяўляюцца пераможцы; 3) спаборніцтва на першынство ў якім-небудзь відзе спорту або ў спартыўных гульнях.

*Спартакіяда – гэта…* 1) масавае спаборніцтва спартыўных каманд і таварystваў па розных відах спорту; 2) фізічныя практыкаванні, якія маюць мэтай развіццё і загартоўку арганізма; 3) міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

*Алімпіяда – гэта…* 1) у старажытных грэкаў – чатырохгадовы перыяд паміж двума святкаваннямі Алімпійскіх гульняў, якія служыў адзінкай летазлічэння; 2) міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы, якія праводзяцца раз у чатыры гады; 3) агляд самадзейнага мастацтва.

✧ *Вызначыце спосаб утварэння тэрмінаў* ***чэмпіянат***, ***спартакіяда***, ***алімпіяда***.

***Практыкаванне 118.*** *Запішыце пяць тэрмінаў свайго віду спорту. Складзіце з імі слоўнікавыя артыкулы для тлумачальнага слоўніка. Структура слоўнікавага артыкула павінна быць наступнай: 1) тэрмін, 2) націск, 3) паходжанне тэрміна, 4) значэнне тэрміна.*